Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ГОЛАС ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 14 — Вільня, Серада 30-га траўня 1928 г. — Год I

У гэтым нумары 6 страніц.

„Вынаязэк“.

Гл. Карэспандэнцыю „Вось як гэта робіцца“.

Пад час крывавых войнаў чалавек ня толькі ня спыняецца над прытарнаваньнем да бойні тых культурна-тэхнічных здабыткаў якія ён мае, але працуе над адкрыцьцем новых засобаў для большага зьнішчэньня свайго праціўніка. Мы — сьведкі вялікай вайны з яе тэхнічнымі чудамі і хімічнымі газавымі атакамі, — дакладна памысьліўшы пераканаемся, што слова „вайна“ з нашага ўжытку ня выходзіць, і што праца над адшуканьнем мэтадаў і спосабоў перамогі мацнейшага над слабейшым—ня спыняецца.

Праўда, цяпер ня грымяць гарматы, не страчаць кулямёты, ня чуваць атруты хімічных газаў, ня снуюць у паветры аэрапляны, а на дарогах цяжаровыя самаходы. Але затое яскрава кідаецца ў вочы штосьці іншае: на месца крывавай вайны—вядзецца вайна „культурная“, на месца тэхнічных прыладаў выступае пяро публіцыстага, які травіць сваю ахвяру, на месца хімічных газаў пускаюцца газы маральнае атруты, маральнага раскладу працоўных масаў. Калі першая крывавая вайна вялася за рынкі, то ціхая „культурная“, — вядзецца за душу дзіцяці. У гэтым змаганьні сьвядомасьць беларускіх масаў здабыла сабе адну пазіцыю—гэтак званыя—языковыя ўставы. Здавалася-б, павінна наступіць зацішша: адна старана павінна-б скарыстаць з праўнага здабытку,—другая сумленна выпаўніць прынятыя на сябе абавязкі. Аднак, змаганьне ня спынілася, а перайшло ў новую фазу, самую страшную па сваім пасьледкам маральнага апусташэньня.

Ратуючы сваіх дзяцей ад духовага калецтва, беларускае сялянства што год засыпае школьныя ўрады масаю дэкларацыяў, жадаючы роднай мовы ў школах. Пры гэтым найсьцісьлей выконываюцца ўсе фармальныя вымаганьні закону аб школьніцтве. Вывад з гэтага, здаецца, павінен быць адзін: даць Беларускую школу згодна з існуючымі законамі, над якімі працавала польская-ж рэакцыя на чале са Ст. Грабскім ў папярэднім Сойме. На жаль, практыка дае вынікі адваротныя.

Злы геній чалавека працуе вечна. Злы геній робіць новыя „выналязкі“ на шкоду працоўных масаў, „выналязкі“ ня хімічныя, ці тэхнічныя, а вышэйшага маральнага парадку. Цёмны, бедны, загнаны селянін інстынктыўна імкнецца да асьветы ў роднай мове, бо толькі ў гэтым ён бачыць сваё культурна-нацыянальнае вызваленьне і збаўленьне ад сацыяльна-эканамічнага ўціску. Злы геній пускае яму ў вочы запраўдную газавую атаку.

Селянін падае дэклярыцыю, дзе жадае ўвядзеньня ў існуючую польскую, ці маючую адчыніцца новую школу *„Беларускае выкладовае мовы*. А Стаўпецкі школьны інспэктар, надрукаваўшы ў Беларускай мове такіх-жа школьных дэклярацый, такімі-ж літэрамі, на такой-жа паперы, якую дае сялянам Т-ва Беларускае Школы, навет з той самай тыпаграфіі ў Вільні, толькі замест жаданьня „Беларускай мовы“ друкуе, што селянін жадае ўвядзеньня ў школу: *„Дзяржаўнае выкладовае мовы“*. Карыстаючыся падуладным яму пэдагагічным апаратам, школьны інспэктар прыкінуўся прыхільнікам Беларусаў і зазначае, што дэклярацыі сялян прыняты, што ён адчыніць з восені Беларускія школы, толькі *закон вымагае, каб яшчэ раз* былі складзены школьныя дэклярацыі на Беларускую школу; тыя дэклярацыі, дзе ён, пан Інспэктар, напісаў, што той самы селянін жадае ўжо *Дзяржаўнай мовы* для свайго дзіцяці. Атака не ўдалася. Дэклярацыі пана Інспэктара пападаюць у Беларускую газэту, як музэйная рэдкасьць, аб якой скажа сваё слова гісторыя.

Мы не бярэмся надаваць праўную кваліфікацыю такім „выналязкам“ пана школьнага Інспэктара Стаўпецкага пав., мы толькі хацелі-бы пачуць у гэтай справе голас тых, хто не атручаны яшчэ да канца зоолёгічным нацыяналізмам і каму так-жа, як і нам, залежыць на справе здабыткаў культуры для нашага працоўнага люду і для нашага краю, на захаваньні хоць прызнаку цывілізацыі ў адносінах урадоўца да грамадзян іншае нацыянальнасьці.

Мы дагэтуль ня ведаем яшчэ напрамкаў у навуковай пэдагогіцы, якая карысталась-бы такімі мэтадамі, як „выналязэк“ пана Шк. Інспэктара Стаўпецкага павету, так-жа, як і ня ведаем, які патэнт і якую акцэптацыю надасьць яму вышэйшая школьная ўлада.

Але аб гэтых рэчах мы павінны падаць свой голас!

Навукі францускіх выбараў.

Як ведама, япошнія францускія выбары адбыліся паводле так званай „аднамандатнай сыстэмы“, якая была „адбудавана“ ізноў — пасьля 8 гадоў панаваньня прапарцыянальнай сыстэмы. Адбудавалі гэтую яўна горшую сыстэму выбараў францускія радыкалы—яўна на сваю галаву і на шкоду наагул лявіцы, а перадусім, як пабачым далей,—на сфальшаваньне ў парляманьце запраўднага голасу і настрою края.

Каб зразумець, аб што тут ідзе, паглядзім на вынікі выбараў, прычым зьвернем увагу ня толькі на лічбы мандатаў, атрыманых рознымі партыямі, але—побач з тым — і на лічбы атрыманых імі галасоў.

Вось гэтая табліца рэзультатаў выбараў.

Кансэрватары здабылі	12 манд.	на 328.000 гал.
Рэспубліканская фэдэрацыя (група Марэна)	140 „	„ 1.008.000 „
Дэмакратычны Саюз (група Пуанкарэ)	94 „	„ 1.226.000 „
Радыкал-нацыяналісты (група Франклін-Буйона)	64 „	„ 552.000 „
Радыкалы	110 „	„ 1.617.000 „
Радыкалы сацыялісты	46 „	„ 324.000 „
Сацыялісты	104 „	„ 1.717.000 „
Камуністы	14 „	„ 1.060.000 „
Іншыя групы драбнейшыя (ў тым ліку камуністы-сацыялісты, здабыўшыя)	2 „	„ 223.000 „
Усяго разам . .		8 м., 55 т. гал.

Навет няўважны пагляд на гэтую табліцу адразу кідае ў вока вялізарную непрапарцыянальнасьць лічбаў мандатаў паасобных партыяў з лічбай атрыманых імі галасоў. Возьмем найгалосьней крычучую пару партыяў: нацыяналістаў Марэна і камуністаў.—Камуністы, якія атрымалі на паўсотні зьлішкам больш галосоў, чым група Марэна, (1 мільён 60 тыс. проці 1 міл. 8 тыс.), здабылі ў 10 разоў меньш мандатаў; 14 проці 140...

Ясна, што гэта выбарная сыстэма — нягодная, крыўдная, папросту праступная—перадусім дзеля таго, што яна страшэнна фальшуе прадстаўніцтва настрояў і волі краю ў парляманьце.

Можна сьмела сказаць, што нідзе, ні ў якой іншай дзяржаве няма такой агідна-нядарэчнай, праступнай „выбарчай ардынацыі“, як ува Францыі.

Шмат дзе выбары робяцца „па-балканску“, навет „па-мэксыканску“, гэта значыць робяцца ці лепш: фальшуюцца ўрадам, з тасаваньнем рознага роду рэпрэсіяў і надужыцьцяў. Але гэта — іншая рэч. Але запраўды-ж нідзе няма таго, каб выбары так фальшаваў сам выбарны закон.

Дык—разгледзім далей нашу табліцу.

Колькі ў ей крыўдаў і недарэчнасьцяў!—

Сацыялісты, напрыклад, — найвялікшая лічбай галасоў партыя ў краі, здабыўшая амаль не на 700.000 галасоў больш, як група Марэна, дый на 100 тысяч. больш, як радыкалы, атрымала на 36 мандатаў менш, як нацыяналісты-рэспубліканцы і — на 6 менш, як радыкалы.

Недарэчная сыстема выбараў пабіла жорстка і самых радыкалаў, якія на папярэдніх выбарах здабылі для лявіцы значную большасьць, а цяпер аддалі большасьць правіцы.

Гэтая права-цэнтравая рэакцыйная палова парляманту складаецца — з 4 першых партыяў табліцы. Яна здабыла разам 3 міл. 114 галасоў, на 8 міл. зьлішкам усіх пададзеных галасоў, гэта значыць—толькі крыху больш, як $^3/_8$. Але мандатаў здабыла яна ўсяго 310 ці—абсалютную большасьць (усяго паслоў у новым парляманьце, павялічаным на 28 паслоў,—612).

Вось усе гэтыя лічбы даюць праўдзівае асьвятленьне так гучна рэклямаванаму факту—быццам „значнаму зруху направа“ ўва Францыі і „вялізарнай перамогі на выбарах Пуанкарэ“. Як бачым, нічога падобнага ўзапраўднасьці ўва—Францыі няма: наадварот—апошнія выбары сцьвердзілі значны зрух настрояў у краі ў бок сацыялістаў і камуністаў, якога ня было дагэтуль: лічбы сацыялістычных і камуністычных галасоў у краі ўсьцяж растуць. Цяпер, пабачым, як-бы выглядаў склад францускага парляманту, калі-б ува Францыі даеяла добрая, правільная выбарная сыстэма—з прапарцыянальным галасом падзелам мандатаў, як напрыклад, у Нямеччыне, ці навет, у Польшчы.

Сацыялісты, як найлічнейшая з партыяў, здабылі-б найбольш мандатаў . . . . 130 гал.
Радыкалы, як наступная па лічбе галасоў партыя, мелі-б мандатаў . . . . 122 „
Група Пуанкарэ мела-б суадказнае ей скромнае месца, маючы ман. толькі . . . . 93 „
Наступная па сіле ў краі партыя камуністаў мела-б і ў парляманьце мандатаў . . . . . 80 „
Толькі пасьля камунстаў ішла-б найвялікшая цяпер—у сфальшаваным крыўдным выбарным законам парляманьце — група Марэна, маючы манд. толькі . 76 „
Група нацыянал-радыкалаў Буйона і Люшэра мела-б замест 64 мандатаў, толькі . . . . . 41 „
і так далей.

Дык, узяўшы ўсе разам, мы мелі-б і ўва Францыі навет вельмі падобны агульны рэзультат выбараў да таго, што далі выбары ў Нямеччыне. Бо-ж і там—найбольш галасоў і мандатаў здабылі сацыялісты. Праўда, нямецкія сацыял-дэмакраты здабылі амаль не траціну ўсіх выбаршчыкаў, як і мандатаў, тады калі ўва Францыі сацыялісты здабылі толькі каля чацьвертай іх часткі. Але камуністы ўва Францыі здабылі суадказна значна больш галасоў, як у Нямеччыне: бо—аж значна больш, як восьмую частку ўсіх пададзеных галасоў—тады як у Нямеччыне—толькі каля аднэй дзевятай часткі.

Як бачым, такому фактычнаму паляўеньню краю адказвала-бы — пры правільнай ардынацыі—і значная левая большасьць парляманту.

Работніцкія партыі мелі-б у ім 210 паслоў, а разам з „чыстымі“ радыкаламі і радыкал-сацыялістамі лявіца мела-б зусім выразную, — большасьць у 360 галасоў — на агульную лічбу 612 паслоў парляманту.

Як падае „Работнік“ у карэсп. з Парыжу, ведамы францускі статыстык Ляшапэль аблічыў, што—ў параўнаньні да папярэдніх выбараў—рэакцыйныя групы ў краі страцілі на апошніх выбарах каля мільёну галасоў, але „затое“ — здабылі 31 новых мандатаў!! Гэта яшчэ раз пацьвярджае, што—аб ніякім зруху направа ня можа быць мовы ўва Францыі. Можа быць мова толькі—аб сфальшаваным ды закрытым ад вачэй сьвету нягоднай арыдвацыяй значным зруху налева, аналягічным такому-ж зруху і ў Нямеччыне.

Карэспанд. „Роботніка“ слушна кажа, што гэты дасьлед навучыць французаў аканчальна ацаніць вартасьць прапарцыянальнай сыстэмы выбараў дый змусіць іх кінуць на сьметнік канчальна агідную сыстэму „аднамандатавых акругоў“. Аб гэтым павінны парупіцца ўсе шчырыя дэмакраты ў францускім парляманьце.

Апроч гэтых усіх вадаў, як мы ўжо высьвятлялі чытачом, француская сыстэма выбараў, агітуючая за асобы, але не за ідэі і праграмы, дый яшчэ з 2 галасаваньнямі, з якіх на другім справы выбару вырашаюць розныя асабістыя ўмовы, падкупы, інтрыгі, страшэнна дэмаралізуе грамадзянства. У дал- так гэтая сыстэма ніколі ня можа загарантаваць, што навет найлічнейшая ў краі партыя правядзе сваіх найлепшых людзей, сваіх найвыдатнейшых павадыроў, што наадварот—цалком гарантуе прапарцыянальная сыстэма, якая ставіць гэтых павадыроў на першыя месцы сьпіскаў. Так, напр., прапаў на выбарах павадыр франц. сацыялістаў Лявон Блюм. Усе гэта—трэба думаць—раз назаўсёды скончыць з гэткай сыстэмай, прынамсь у яе найгоршай францускай форме. Чаму гэта францускія радыкалы, якія мелі вялізарную большасьць дый цалком у сваіх руках парлямант, зьмянілі лепшую сыстэму на горшую, якая пабіла іх самых, а яшчэ бальней тую лявіцу, з якой радыкалы традыцыйна заўсёды супрацоўнічалі ў парляманьце, гэта—іх сакрэт партыйнага розуму...

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

Апошнія дні.

У апошнія дні закончылі свае прамовы пракуроры і старшыня Суду ўдзяліў голасу абароне. Першым забірае слова адв. Сьмяроўскі.

Прамова адв. Сьмяроўскага.

Высокі Суд! Канчаем тут вялікі, можа, навет, найвялікшы палітычны працэс, які перажыла Непадлеглая Польшча. Усе мы выканалі калясальную працу і вось ўжо зблізжаемся да разьвязкі. Нас усіх агортвае ўзварушаньне, бо прыгавар, датычучы 56 асоб, грамадзян нашага краю і бацькаўшчыны, мае задэцыдаваць аб іх лёсе, шчасьці або няшчасьці. І вось вы, паны судзьдзі, пачулі з вуснаў пракурора ўнёсак, каб гэтых грамадзян пазбавіць асабістага і сямейнага жыцьця. Гэтага, паводле зданьня пракурорскага ўраду, дамагаецца ад вас, высокія судзьдзі, Польшча, дамагаецца дзеля таго, што кахае сваіх грамадзян. Гэтымі грознымі славамі скончыў сваю прамову пракурорскі ўрад.

Калі мы цяпер кінем вокам назад на ўсе разважаньні пракурораў, калі затрымаемся над усімі тымі аргумантамі, якімі пракуроры хацелі пакіраваць нашым суменьнем, то паўстане страшнае і балючае пытаньне — у чым абвінавачваюць гэтых 56 чалавек? У гэтым працэсе, якому павінна прыглядацца ўся Польшча, якому прыглядаецца ўся Эўропа, ба, цэлы сьвет, мы не атрымалі ад пракурораў падставовага адказу на пытаньне— у чым абвіняюць? А дзеля гэтага сталася рэч

нязвычайная: акт абвінавачаньня перачыркнуты, хаця ў справе нічога не зьмянілася. Канцэпцыя акту абвінавачаньня заменена іншай, нічога супольнага з нашай справай ня маючай. Гэта, высокія судзьдзі, не драбязга, гэта—катастрофа пракурорскага ўраду.

На лаве абвінавачаных засела палітычная арганізацыя „Грамада“, якую з тых ці другіх прычынаў было пастаноўлена пасадзіць на гэтую лаву. А пракуроры нам кажуць — мы не абвіняем за прыналежнасьць да Грамады, але за арганізацыю „śpisku“ (загавору) ў „Грамадзе“. Калі-ж мы аграні́чымся навет і гэтым „śpiskiem“, то і тут мы ад пракурораў не атрымліваем ніякіх адказаў на пытаньні, што гэта быў за „śpisek“, якая была яго структура, сувязі арганічныя? І чаму адразу не абвінялі паасобных сяброў Грамады ў прыналежнасьці да КПЗБ—трудна даць адказ... І дзеля гэтага пракуроры раз абвіняюць Грамаду, другі-ж раз паасобных яе сяброў у прыналежнасьці да КПЗБ. Учынку, як бачым, пракурорскі ўрад не опрацызаваў. Няма дзеля гэтага такога сумленьня праўнага, якое-б згадзілася на падобную кваліфікацыю.

Трэба разгледзіць ўсе магчымыя канцэпцыі і выбраць з іх такую, якая заспакоіла-б ваша судзейскае і праўнае сумленьне.

Грамада, як „зборны“ абвінавачаны.

Гэта—першая канцэпцыя. Але-ж, высокія судзьдзі,—Бел. Сял.-Раб. Грамада ёсьць арганізацыяй легальнай, знаходзячайся пад ахранай уставаў Рэчыпаспалітае. Пан пракурор уважае, што так могуць разважаць толькі абаламучаныя масы, бо яны не разумеюць, што легалізацыя палягае на зацьверджаньні праз улады. Гэтае розьніцы не разумеюць аўтары акту абвінавачаньня. Хутчэй—самі пракуроры абаламучаны. Рэчай вядомай ёсьць, што ад палітычных партыў не вымагаецца легалізацыі іх праграмаў. І дзеля гэтага—нашто-ж рабіць дар Данаеў і, апіраючыся на тым, што ніякая партыя не патрабуе легалізацыі, у пэўнай хвілі, выгоднай ці невыгоднай, лічыць яе за нелегальную і цягнуць да адказнасьці. Сяньня партыі легалізуюцца сваей працай, ведзенай пад кантролем ўраду.

Бяз сумліву, сяньня камуністычная партыя зьяўляецца нелегальнай. Але цэлы рад арганізацыяў вядзе яўную і легальную працу і праз сваю пэўнасьць ёсьць легалізаваны. У гэтых варунках арганізацыя „Грамада“ была пад апекай уладаў Рэчыпаспалітае.

Масы агарнула перакананьне, што арганізацыя працуе ў praworządnej дзяржаве і будзе ахраняна ўставамі. Калі на абшары арганізацыі былі гэткія ці іншыя праступкі, то яны маглі быць заўсёды пакараны, але ня цэлая арганізацыя. Можа гэтых праступкаў была так многа, што трэба было Грамаду разьвязаць? Але тут гэтага няма. Тут Грамада актам волі з арганізацыі легальнай сталася нелегальнай. Паны судзьдзі, арганізацыя мае сваю праграму. А ў гэткай масавай арганізацыі праграма зьяўляецца Канонам, эвангэліей, якая ідзе з цэнтра ў мора, вырабляе душы, фармуе іх. Праграма—гэта прыцягаючая сіла, сьцяг, пад якім ідзе арганізацыя, варунак яе існаваньня. І сказаць, што Грамада мела дзьве праграмы — адну для ўлады, а другую для сябе — ня можна. Сказаць, што было два абліччы перад 87 тысячамі людзей—гэта бязмысьліца. Падвойная палітыка ў масавай арганізацыі — гэта недахоп лёгікі. Цьвярдзіць, што, калі навет на абшары 87-тысячнае арганізацыі некалькі сотняў і імкнецца да выкліканьня паўстаньня,—да гэтага імкнецца ўся Грамада—няпраўда, бязмысьліца.

Паны судзьдзі, які можа быць адказ на гэту першую канцэпцыю? Адказ далі самі пракуроры, адступаючы ад яе, дзеля чаго яна замянілася ў грузы. А за гэтым—ня можа быць мовы аб кары за прыналежнасьць да Грамады, як легальнае арганізацыі, згодна з арт. 1. К. К.

Трэба было перавярнуць акт абвінавачаньня ўверх нагамі. Я ведаю, што пракурор паклікаецца на арт. 753, але ён тут няможа мець месца. На помач абвінавачаным прыходзіць тут іншая канцэпцыя: што ёсьць дазволена, ня можа быць адначасна не дазволеным. Мусіць быць дзеля гэтага зьліквідавана ўся справа. Але я прыймаю вызаў паноў пракурораў і прыступаю да абгаварэньня новых канцэпцый.

Самадзельны „śpisek“ на абшары Грамады.

Прыступаю цяпер да аналізы „śpisku“. І тут пракурор ня даў канструкцыйнага абраза. Можна толькі дадумвацца, што „śpiskiem“ кіравалі тыя самыя асобы, што і Грамадой. Але-ж гэта справы ня вычэрпвае. Śpisek—гэта-ж арганізацыя, якая імкнецца да гвалтоўных чынаў; мусіць мець у сваім распараджэньні тое, што прадбачыць арт. 102—склады аружжа. Ці сьцьверджана, што склады аружжа былі?

Пазволю сабе спытацца вас, высокія судзьдзі, ці тое, што ёсьць у акце абвінавачаньня і чаго шукалі праз увесь год — ці гэта можна кваліфікаваць, як склады аружжа? Гэтых некалькі зьвішчаных карабінаў — гэтага-ж замала, як на склады аружжа. Прашу пашукаць такога праўніка, які-б згадзіўся на канцэпцыю складаў аружжа.

А што-ж кажуць сьведкі аб складах аружжа?

Першы сьведка Ясінскі асьвядчае, што складаў аружжа не спаткаў. Мэйер, экспэрт, сьцьвярджае, што 1926 год быў найменш адпаведным годам для паўстаньня. Яшчэ у 1925 г. магла быць мова аб адзысканьні Незалежнае Беларусі шляхам паўстаньня. Ад часу-ж прыняцьця аховы пагранічча праз КОР ня можа быць месца для гэтых лятуценьняў. Як сьведка, Мэйер кажа, што ў арганізацыі галоўную ролю адгрывала-б аружжа, здабытае шляхам разбраеньня паліцыі і войска. Агульныя паказаньні сьцьвярджаюць, што аружжа ня было, тое-ж самае гавораць і паасобныя сьведкі; як напр. паліцыянты Бучало, Пшэзьдзецкі, Каварскі і інш., якія спэцыяльна сачылі за гэтым і нічога не знайшлі. Гэтае аружжа ёсьць так няўхватнае...

Калі мы жадаем у імя „Miłującej Polski“ кваліфікацый з арт. 102, дык мусім даказаць факт існаваньня тых рэчаў ўжо ня ў імя міласьці да Польшчы, але ў імя элемэнтарных падставаў справядлівасьці. Гэтага-ж даказаць не ўдалося і дзеля гэтага я цьвярджу, паны судзьдзі, што кваліфікацыя з арт. 102 пярэчыць усім фактам.

Сабатаж падаткаў, камасацыі, дэзэрцыя з войска і шпіёнства.

Пераходжу да квэстыі неплачэньня падаткаў. Люднасьць зацягвала падаткі. Былі прыпадкі апору. Але-ж якое гэта мае значэньне для кваліфікацыі „śpisku“? Можа гэта падпадаць пад арт. 129, 125, але ніколі пад 102. Зацягваньне падаткаў гэта навет чыннасьць легальная. Платнік мае права не плаціць аж да хвілі, калі ня прыедзе экзэкутар. Тое самае і з камасацыяй. Па паўстаньню Грамады быццам перарвалася камасацыя. Але ж, паны судзьдзі, мы ведаем са справаздачаў мін. Станевіча, што якраз наадварот камасацыя грунтаў у 1926 г. дасягае свайго максымума.

Затрымаймася яшчэ над арганізацыяй „śpisku“. Ці былі высыланы праз Грамаду акульнікі, заклікаючыя да дэзэрцыі? Гэтага ня сцьверджана. Ды і наагул, калі зачапіць справу дэзэрцыі, дык тут навет некаторыя сьведкі з боку абвінавачаньня цьвердзяць, што Грамада забараняла дэзэрцыі; напр. сьведка Валігурскі. Што-ж датычыцца шпіёнства, дык на 87 тысяч сяброў Грамады было можа некалькі асоб, якія гэтым займаліся. Але-ж, ці палітычная арганізацыя спраўджае маральныя кваліфікацыі сваіх сяброў? Зразумелая рэч, што да Грамады ня прыймалі праз балятыроўку, як да клюбу. А дзеля таго, што мела месца некалькі выпадкаў шпіёнства, дык цьвярдзяць, што ўся Грамада гэтым займалася?

Лятуценьні аб непадлегласьці Беларусі.

А затым мы бачым, што няма ніякіх канкрэтных довадаў для кваліфікацыі spisku. Аружжа няма, факт шпіёнства, напады адпадаюць і пракурор навет зрокся абвінавачваць з гэтага боку. А можа довадамі зьяўляецца тое, што дамагаліся амнэстыі, ці тое, што пялі народны беларускі гімы, ці можа ўрэшце лятуценьні аб незалежнасьці Беларусі? Але ж, паны судзьдзі, сьвядомасьць народная беларуская існуе, мы зьяўляемся сьведкамі прабуджэньня яе з доўгага сну, гэтае сьведамасьці — ніхто гэтага не затрэць. Змаганьне з ёй, апрача страт, нічога вам не прынясе. І мы ўсё перад 30 гадамі лятуцелі аб паўстаньню і жылі гэтымі лятуценьнямі. Тут таксама 87 тысячам людзеў здаецца, што могуць здабыць Незалежнасьць. Але гэта ў сучасны мамэнт толькі лятуценьні і я вам, паны судзьдзі, зусім ляяльна пастаўлю пытаньне — ці вы верыце ў тое, што на вясну 1927 г. магло выбухнуць паўстаньне? Я цьвярджу, што не.

Высокія Судзьдзі! Тарашкевіч у сваей апошняй прамовай ў Сойме, у студзеню 1926 г. наваліваецца на тых, якія хочуць справакаваць паўстаньне, бо ведае, што ў моры пралітае крыві можна ўтапіць ідэю Незалежнае Беларусі.

Грамада, як экспазытура Kominternu.

Гэта трэцяя канцэпцыя. Заходзіць пытаньне — якой арганізацыяй была Грамада? Грамада была арганізацыяй палітычна-грамадзкай і нацыянальна-радыкальнай. Можа нам гэта не падабацца, але мы, як судзьдзі, як праўнікі, ня можам разглядаць справы ў гэткі спосаб. Есьць многа сутычнасьцяў у праграме Грамады і камун. партыі, але гэтых арганізацыяў ня можна ідэнтыфікаваць. Сьведка Ракоўскі казаў, што праграмы былі падобныя, але аб розьніцы дэцыдуе тактыка. А тактыка Грамады была зусім іншая — яўная, лёзунгі легальныя. Ідэя беларуская становіцца сілай, з якой Польшча павінна лічыцца. У гэтым няма нічога карыгоднага. Компартыя імкнулася разьвіць свае ўплывы ў Грамадзе. Але гэта самае яна робіць і ў іншых партыях. Згары можам сказаць, што гэтыя высілкі былі толькі на пэрыфэрыях, але ня ўцэнтры. Можна была зьліквідаваць гэтыя ўплывы, але гэтага ня зроблена. Чаму гэтак сталася? Ці ня дзеля таго, што адносна гэтых людзей ня можна было даказаць іх прыналежнасьці да КПЗБ? І ўсюды, дзе гэтае сувязі ня ўстаноўлена, там пацягнута да адказнасьці за прыналежнасьць да Грамады. Гэта не зьяўляецца судовым вырашэньнем справы.

Адналітасьць ідэолёгіі Грамады і Кам. партыі ня можа ўтрымацца з пункту гледжаньня пракурора. Усюды камуністы падтрымліваюць пачуцьцё абасобленасьці і змагаюцца з ідэнтыфікацыяй. З свайго боку Грамада ўсувала тых сяброў, адносна якіх было сцьверджана, што належаць да іншых партый, ня выключаючы і камуністычнае. Што-ж датычыцца акцыі ўнутранай, то гэта — квэстыя палітыкі. Мы бачылі навет, што ў пэўных хвілях і нарадовая дэмакрацыя (эндэкі) не змагалася з камуністамі, калі гэта з палітычных поглядаў было выгадна. Гэтак было пры апошніх выбарах у Сойм.

І гэта — трэцяя канцэпцыя—распадаецца, як і дзьве папярэднія.

Што-ж астаецца? Грамада—гэта легальная арганізацыя. Ніякага „śpisku“, залежнага ад кам. партыі, ня было. Пазастаецца толькі праступак, прадугледжаны 110 арт. К. К.

Беларуская прэса.

Адным з довадаў, сцьвярджаючых сувязь Грамады з кам. партыяй, мела быць разьвіцьцё прэсы. Пан Васілеўскі казаў, што на прэсу было выдана 190 тыс. злотых. Але Васілеўскі не прадставіў ніякіх дакумэнтаў. Затое абв. Рак-Міхайлоўскі прадставіў падрабязна апрацаваную справаздачу, з якой відаць, што на прэсу было выдана 87 тыс. 554 зл. Гэта расцярушвае квэстыю субсыдыі зусім. Адначасна Рак-Міхайлоўскі на падставе кніг і паказаньняў сьведак аблічыў даходы за ўвесь гэты час, якія выносілі 69 тыс. зл. Дэфіцыт 17 тыс. зл. мог быць пакрыты з фундушаў пасольскіх, складак, прадажы друкаў і г. д. Прашу прадставіць рахункі, дакумэнты і тады будзем палемізаваць.

А цяпер справа подкупу паслоў праз „Вялікага Містра“.

Гданская канфэрэнцыя і Гурын.

Там, дзе хочацца перачыркнуць усю культурную здабычу чалавека, апошліць і пакрыць ганьбай яго жыцьцё, там трэба абапёрціся на доказах. І вось, зьяўляецца Гурын. Хачу даказаць, што тое, што казаў Гурын, было няпраўдай, бо праўдай быць не магло. Крыніца веды—Гурын — адзін толькі ведае аб канфэрэнцыі гданскай. На пытаньне першае вагі—ці можна яму верыць—адказваю, што гэта такі сьведка, якому, хочучы астацца ў згодзе са сваім сумленьнем, верыць ня можна. Я не хачу тут займацца спрэчкай адносна асобы канфідэнта, але фактамі даказаць—кім быў Гурын. Ад 19/I 1925 года Гурын перастае быць у кантакце з камуністычнай партыяй, сам кажа, што згубіў з ёй сувязь. Ен-жа быў прадажнікам, рэнэгатам ад хвілі, як зрабіўся канфідэнтам паліцыі. І нічога ведаць ня мог. Скуль-жа ён, Гурын, рэнэгат, прадаўшчык, выкінуты па-за абруб партыйнага жыцьця, мог ведаць аб спробах подкупу Тарашкевіча, аб складзе камуністычнае фракцыі ў Грамадзе, аб тым, што Тарашкевіч быў у Гданску? Гэта, паны судзьдзі, толькі звычайная хлестакоўшчына і нічога больш.

А на пытаньне судзьдзі сьледчага, скуль пан гэта ведае, адказвае: ведаю гэта ад Тарашкевіча. Гэта адказ дзіўны. Ці-ж Тарашкевіч ёсьць такім лёгкамысным, што ня ведае, кім зьяўляецца Гурын у жніўні? Урэшце Гурын кажа, што ведае аб гэтым ад асобы, прозьвішча якой сказаць ня можа. Тыповы выкрут канфідэнта. А тут яшчэ гразяць даўгія гады вастрогу. Усё яго паказаньне—гэта інсынуацыя і зганьбленьне. На гэтым можна з Гурыным скончыць — абвінавачаньне з арт. 110 адпадае разам з ім. Трэба жалець, што ён ня мог прыбыць на суд—бо спаткаў-бы яго лёс Бабіча.

Іншыя сьведкі абвінавачаньня.

Бабіч—гэта сьведка, які нічога не памятае. Мы стараліся зэрыфікаваць падава-

---

Воля і доля сялян-беднякоў.

(Апавяданьні).

Нарада.

За тыдзень перад сходам, на які павінны былі прыйсьці выбраныя ад вёсак людзі, Дзяцел у сваім пакою сабраў старастаў і верных сабе людзей на нараду. Усе ўжо трохі падпілі і глядзелі на „пана“ старшыню пасалавеўшымі вачыма.

— Ну, як, мальцы, — зьвярнуўся да іх старшыня,—што ў вас добрага чуваць? Каго мужыкі думаюць выбраць на старшыню?

— Чуваць кепскавата—адказаў староста Мілаўскай грамады — цябе, пане старшыня, усе вясковыя страшэнна ня любяць, хочуць выбраць Вяршылу з Дубнікаў: ён то ня надта гэтага хоча, кажа „я ўсе роўна доўга там не праслужу“, але супраць цябе падымае ўсю маю грамаду.

— А хто з ім яшчэ руку трымае?—запытаў у яго Дзяцел.

— Да яго часта прыходзяць чытаць газэты Антось Пірог з іхняй вёскі, Зьмітрок з Падгорнай ды Язэп Бандар з Крывасельля; гэта адзін дух з ім.

— „Прашу запісаць“! зьвярнуўся да пісара старшыня—я аб іх пагавару са станавым, ён знойдзе якую прычэпку ды пасадзіць хоць на час выбараў.

— „Есьць“! адказаў той, падміргнуўшы вокам.

— А ў цябе як? — запытаў у старасты Бяневускай грамады.

— У мяне найбольш бунтуюць Асінаўцы і ў іншых ёсьць па чалавечку.

— „Ідзі сюды, бліжэй“! прыказаў яму старшыня—скажы іх прозьвішчы пану пісару! Я іх назначу на той дзень ў падводы, а калі-б і не хацелі ехаць, дык, дзеля пэўнасьці, пашлю туды стражніка.

Староста пачаў пералічваць:—Астапчык ..., Бадрак Грыгор, Карыта... а пісар толькі скрыпеў пяром, запісваючы „бунтаўшчыкоў“.

— А мне што з імі рабіць? — запытаў у старшыні староста Цялеўскай грамады.

— Табе?—Твая грамада далёка ад гміны, самі яны не даведаюцца, а ты аб'яві ім, што сход ня 17 га, а 18-га. Ха-ха-ха!—зарагатаў Дзяцел:—няхай прыходзяць на заўтра! Нашым скажам праўду!

Староста спусьціў у дол вочы і падумаўшы, адказаў.

— Як даведаюцца—будуць лаяць, а могуць яшчэ і па карку надаваць.

— „Ня бойся“!—падбадзёрваў яго старшыня, — няхай папрабуюць толькі! А калі будуць лаяць—дык скажаш, што абмыліўся.

— Наагул, мальцы,—зьвярнуўся да ўсіх прысутных Дзяцел—старайцеся, каб папрыхадзілі толькі нашы людзі; хай яны там па вёсках, дзеля падводу вачэй, брэшуць на мяне, як хочуць, я гневацца за гэта ня буду, а то іначай могуць ня трапіць на сходку. Скажэце, што я іх не забуду: і пазыку з гміннай касы атрымаюць, калі захочуць, і работы ім буду аддаваць на выгадных варунках, і ў падводы рэдка паедуць і ўсё такое. А вам, хлапцы,—сказаў ён, выймаючы з кішані партманэт, цяперака дам па трыццатку рублёў на расход: падпаіце, каго трэба, а каму і сухой арэнды пятку дайце, калі мала будзе абяцанкі!

— Зашуршэлі сінія ды чырвоныя ў руках старшыні; усе па чарзе бралі грошы.

— Табе дам пяцьдзесят—сказаў ён Мілаўскаму старасьце—бо твая больш бунтаўнічая грамада.

Усяго разьдзяліў больш двохсот рублёў. (Глупства! Крыніца-ж яшчэ ня высахла)!

— Нагаварыліся, аж у горле высахла, трэба мусіць было-б прамачыць, як вы думаеце?—жартаўліва запытаў Дзяцел сваіх кумпанаў.

— Трэба было-б! Не зашкодзіла-б!..—адазваліся яны.

— Ну, дык ідзеце да Шмэркі і загуляйце сабе добра. Я з вамі не магу быць, самі ведаеце, не выпадае—з вясковых можа хто ўбачыць. Шмэрка ведае аб гэтым і дасьць усё, што трэба.

— Нічога, і бяз пана старшыні там парадак павядзём! Дзякуем! — адазвалася некалькі галасоў.

— Старайцеся, мальцы, пакуль я буду старшынёй, то і вы за мной пажывяцё, ня скрыўджу!

— Добра! Пастараемся! Самі ведаем гэта!—дружна адказалі кумпаны і пачалі, сьпяшаючыся да Шмэркі, выходзіць з пакою.

Сходка.

17-га, а гадзіне дзевятай пачалі сяляне па аднаму і невялічкімі грамадкамі сходзіцца да гміны. Віталіся. Усюды чулася трывожная гутарка.

— Чулі? Вяршылу-ж арыштавалі!

— Калі?

— Ды тры дні таму, яго дый яшчэ трох чалавек з ім захапілі!

— За-што?

— А хто іх там ведае,—кажуць, якіясь кніжкі знайшлі.

— Ай-яй, вось бяда!

— А ці можна яго будзе выбіраць на старшыню?

— Ня ведаю, мусіць можна!

— А калі ня можна, што тагды рабіць? Трэба, браткі, згаварыцца, на каго галасаваць, калі на яго не пазволяць!

— Што аб гэтым загадзя гаварыць, як усе зьбяруцца, тагды й згаворымся—гаварылі, пераміргіваючыся з некатарымі з сялян, агенты старшыні і пераводзілі гутарку на другую тэму.

— Ці чулі, што ў Міхееўцах мінулую ноч воўк каня зьеў?—гаварыў адзін.

— А ў Дуброўках на-днях дык укралі і каня і воз з упражай!—расказваў другі.

Усе, слухаючы, ахалі і распачалі гутарку аб ваўках, а зладзеях, аб тым, што многа іх цяпер разьвялося ў нашай старонцы. Да дзесяцёх гадзін сабралася да двохсот чалавек. Часьць сядзела ў гміне, многія стаялі на дварэ, але тут і там круціліся сялянскія „прыяцелі“ і ўсе баялі, што японец хоча ваяваць, Англія—зямлю узарваць, цар — міласьць паслаць, а сяляне разьзявіўшыся, слухалі, як тая варона з сырам у басьні Крылова.

Але вось з пакойчыку выйшаў пан земскі, пісар і важна селі за сталом; за імі ўвайшоў Дзяцел і то ж сеў за кратамі, але ў старонцы на крэсьле.

— Сабірайся, сходка пачынаецца! — закрычэлі на дварэ.

Усе павалілі ў гміну: паўстаў шум, дзьверы скрыпелі бязупынку. Мінют пяць сэкрэтар з земскім нешта ціха гаварылі, потым пісар, стаўшы, закамандаваў:

— Цішэй! Сход аб'яўляецца адчыненым! Пан земскі хоча вам сказаць пару слоў.

Земскі падняўся з крэсла і, выставіўшы свае тоўстае бруха, загаманіў:

— Сяляне! Можаце выбіраць, каго хочаце, на старшыню, але я прапаную вам зацьвердзіць старага—пана Дзятла. Ён ужо прывык, службу спаўняе акуратна, кнігі ў яго ўпарадку—лепшага трудна вам будзе знайсьці. Назначайце кандыдатаў!

— Старага!! Дзятла!! — закрычэлі старшыновы староньнікі, якія таўпіліся наўперадзе ля кратаў.

— Вяршылу!!! — крыкнула большасьць прысутных.

— Вяршылу—паясьніў земскі — выбіраць ня можам, бо-ж ён арыштаваны, як процідзяржаўны праступнік і ня ведама, калі яшчэ выйдзе з турмы.

— Г-м... ня можна... Каго паставім? За каго галасаваць? — пачуліся шэпты на салі, але ўжо быў ня час згаварвацца.

— Назначайце яшчэ кандыдата!—націскаў земскі.

— Сыманюка! Шумілу! Саковіча!—хто ў свой голас крычалі дальшыя. Земскі пашап-

ныя праз яго факты, але ён нічога не памятаў. Не памятаў, як выглядаюць Мінскія Лашыцы, скуль уваходзіў у Крэмль, дзе жыў у Гданску і Бэрліне. Гэта выяўленае лганьнё абурала нас усіх. Яго паказаньні прыстычнасьці з рэчавістасьцю рассыпаюцца, і на іх ня можна будаваць абвіненьня з арт. 102 Ч. II, і арт. 110 К. К.

Астаецца Кузьма ў расказе Капнэра. Але ў яго пісьмах ёсьць столькі глупстваў, што трудна ў гэта верыць. Трудна верыць, каб грошы на дывэрсыйныя банды атрымліваны праз Бел. Пас. Клюб, каб кс. Станкевіч быў пачтальёнам і даваў грошы Сымону Рудому, грошы ад „Вялікага Містра".

Гэта—доказы кантакту бел. паслоў з „Вялікім Містрам". Натарычныя ілгуны ня могуць быць філярамі абвіненьня і навет калі дадаць „Miłość Polski". Ясна, што акт волі можа запоўніць вастрогі, але прыгавор ёсьць рэзультатам справядлівасьці, дзівам, што тварыць справядлівасьць, але ня актам волі.

Р.-Міхайлоўскі і Тарашкевіч.

Што датычыцца Рак-Міхайлоўскага, то яго інтэрвэнцыя ў справе канфіскат беларускае прэсы ня можа быць праступкам. Яго ўдзел у дэманстрацыі і яго інтэрвэнцыя ў гэтай справе ў прак. Штэймана, каб спыніць няшчасьце, якім зьяўляецца галадоўка, гэта становішча ляяльнага і мудрага грамадзяніна. Што гэтыя закіды маюць супольнага са сьпіскам, з 102 арт.? Ня толькі сьведкі з беларускага грамадзянства, але і з польскага схарактэрызавалі Р.-Міхайлоўскага, як чалавека, які імкнуўся да паразуменьня з Польшчай, палёнафіла. Гэта чалавек, які, калі для Польшчы ўжо згублены, дык трэба вельмі і вельмі жалець.

Што да Тарашкевіча, дык пяройдзем адразу да тых цяжкіх закідаў, як прадажнасьць, і кар'ерызм палітычны. Ці ж гэта кар'ера, што сядзіць у вастрозе? Ці можа кар'еру яму хоча зрабіць пракурор, жадаючы даўгіх гадоў вастрогу? І чаму пракурор назваў яго „barbarzyńcem"? Ці можа таму, што да апошняга верша пэратлумачыў на беларускую мову, седзючы ў турме, Іліяду? Ці можа таму, што прысвайвае беларускай культуры „Пана Тадэўша"? Ці можа дзеля таго, што хоча ўвесьці лацінскую абацэду?

Чаму-ж затым пракурор назваў яго гэтак? Можа дзеля таго, што шукаў супольных шляхаў з Польшчай, што заўсёды кіраваўся на Захад? І ці-ж ня было ніякіх шляхоў да паразуменьня, апрача вастрогу і працэсу? Ці не павінен тут прыйсьці акт вялікае палітыкі, вялікае творчасьці?

Успомніце, паны судзьдзі, што тут казалі Тугут, Касмоўская, Хамінскі. Свае вялікія сілы Тарашкевіч мог прынесьці Польшчы не як ахвяру, даніну, не як карны падданы, але на падставе раўнаважнае замены. Ня мог гэтага зрабіць, бо спатыкала яго з польскага боку дэмагогія, шавіністычная ненавісьць, трактаваньне, як грамадзяніна другой катэгорыі.

Роля мая скончана. Разумею, што пэўнасьцю ня вычарпана. Можна ліквідаваць сваіх палітычных праціўнікаў, калі дзяржаўныя інтарэсы гэтага вымагаюць, але ня можна ліквідаваць іх з помачу Суда бо тады, паны судзьдзі, акт справядлівасьці робіцца проста загадам ураду.

Прамова адв. праф. Пятрусэвіча.

Паны судзьдзі! 10 сакавіка 1864 г. вось тут, на гэтым пляцу, перад гэтым-жа будынкам, у якім цяпер адбываецца працэс Бел. Сял.-Раб. Грамады, зьгінулі мучанікі „за нашу і вашу вольнасьць". На гэтым пляцу зьгінуў Кастусь Каліноўскі, першы выдавец беларускае часопісі пад наз. „Мужыцкая Праўда". Каліноўскі пакінуў па сабе тастамэнт, у якім заклікае беларускі народ да злучэньня свайго лёсу з паўстаньнем, асьцерагаючы адначасна перад найстрашнейшым ворагам—Масквой.

Але паўстаньне было ўтоплена ў моры крыві. Тыя, што змагаліся „за нашу і вашу вольнасьць"—знайшліся ў вастрогах і тайгах Сыбіры. А іхняе прышлае пакаленьне зьмяніла лёзунг „за нашу і вашу вольнасьць" на іншы—лёзунг працы арганічнае. Бо гэтага вымагала хвіля.

Я цьвярджу, паны судзьдзі, што каб навет зусім ня было беларускага руху, дык і то трэба было-б яго выклікаць. Але гэты рух нарадзіўся сам і першымі піянэрамі яго была польская шляхта. Ці гэта будзе Рыпінскі, ці Чачот, ці Дунін-Марцінкевіч—усе яны былі прадстаўнікамі гэтага маладога руху і разумелі, што пачуцьцё народнае асабліваcьці трэба абудзіць, бо на народзе беларускім усё больш і больш выігрывала Масква.

Паны судзьдзі, пакуль будзе існаваць Польшча, датуль будзе і змаганьне паміж Варшавай і Масквой. І мы не павінны забывацца, што паміж Масквой і Варшавай ляжыць вялізарная раўніна, заселеная беларускім народам.

Бяз сумліву, пакапае той, хто будзе мець за сабой беларускі народ. А ціж беларускі народ варожа спатыкаў польскія войскі? Не, спатыкаў іх з хлебам і сольлю.

Беларускія дзеячы таксама орыентаваліся на Польшчу. Луцкевіч едзе да Парыжу. Былі ўсе варункі, каб пакапаў Рым, а не Візантыя. Але што Польшча зрабіла ў гэтай палючай справе? Нічога. Я не зьяўляюся максымалістам і мне сяньня выдаецца гасла „за нашу і вашу вольнасьць" максымальным. Але я цьвярджу, што пакуль Польшча існуе, яна мусіць мець „Крэсы", бо гэта — квэстыя яе існаваньня. І канстытуцыя—гэта ня кусок паперы. У ёй ёсьць арт. 109 і 110. Калі народ беларускі хоча мець свае школы, дык трэба іх яму даць. Трэба памятаць, што ў гэтай мове быў пісаны Літоўскі Статут, гэта вялікая кадыфікацыя, хаця прадстаўніка гэтага народу пракурор назваў „barbarzyńcą". Тварэньне масавых працэсаў добрых рэзультатаў не дае.

П. пракурор, кажучы аб словах Пэтронія да Вініцыя (раман Сенкевіча „Quo Vadis") „ты шчасьлівы", забыўся дадаць, што ён таму чуўся шчасьлівым, што зьяўляецца рымскім паўнапраўным грамадзянінам. А як-жаж чуецца той, хто гэтага аб сабе сказаць ня можа; той, над кім была распачата апека дакучлівая і неразумная. Гэтая апека зьяўляецца мамэнтам, які найбольш зашкодзіў і папсуў адносіны паміж польскай дзяржаўнасьцю і беларускім народам. Квэстыя беларуская ўсьцяж стаіць у-ва ўсей сваей велічыне. Аб павазе яе сьведчыць хоць-бы лічба 200 тысяч (?) галасоў, адданых на беларускія сьпіскі падчас апошніх выбараў у Сойм. З гэтым трэба лічыцца.

Далей праф. Пятрусэвіч у глыбокіх і навуковых вывадах, апіраючыся на Кодэксах іншых дзяржаў і на праўна-судовай практыцы, адкідае магчымасьць абвінавачаньня ў гэтай справе па 102 арт. К. К.

П. пракурор, — кажа праф. Пятрусэвіч, чытаючы „Quo Vadis", не зразумеў добра яе зьместу, бо інакш пераканаўся-б, што права дамаганьня амнэстыі ёсьць правам абсалютным. Ці-ж сам Пэтроні ня змушае Нэрона, каб даў амнэстыю? А калі ходзіць аб помач вязьням, дык ці-ж Пэтроні пакідае Лігію без апекі?

Абарона і палітычныя працэсы.

Я вельмі дзякую п. пракурору, што не падаў празьвішча адваката, які прыходзіў з помачу палітычным вязьням. Адв, Родзевіч цешыцца такой павагай, што гэта-б яму шкоды не прынясло. Ен можа толькі гардзіцца, што выступаў у палітычных працэсах па просьбе беларускіх паслоў. Ці п. пракурор можа цьвярдзіць, што ніхто з гэтага працэсу ня выйдзе жывым? Калі не, дык мы тут зьяўляемся патрэбнымі. Калі да лекара ў хвілі небясьпекі прыходзіць хворы—ці лекар можа адмовіцца ад помачы яму? Зусім непатрэбна дзеля гэтага знайшоўся ў акце абвінавачаньня параграф аб амнэстыі. Усе мы добра ведаем, чым была шлісэльбурская турма. У ёй хавалі людзей. Там ня было прозьвішчаў, а толькі нумары. І вось кн. Дундукава пасьвядчае ўсё сваё жыцьцё, каб ратаваць людзей, якія туды папаліся. І ёй трэба дзякаваць, што тут у Вільні мы маем прафэсара на U. S. B., які, хоць прасядзеў 20 гадоў у гэтым вастрозе, усё ж такі быў ратаваны для жыцьця і навукі.

Абв. Астроўскі і Бел. Банк.

Праф. Пятрусэвіч характэрызуе папярэднюю дзеяльнасьць Астроўскага і абгаварвае паказаньне сьведак, датычучыя Астроўскага. Пасьля пераходзе да Бел. Банку.

Кожная арганізацыя—кажа праф. Пятрусэвіч—ці то нарадовая, ці грамадзкая, палітычная імкнецца да стварэньня асяродка гаспадарчага жыцьця. Нічога дзіўнага, калі і беларускае грамадзянства імкнулася да стварэньня свайго Банку. А што імкнулася, сьведчыць тое, што помач сваю ураду Сікорскага паставіла ў залежнасьць ад выданьня канцэсіі на банк. Калі-ж канцэсіі не атрымала, дык залажыла свой Банк каапэратыўны. Усяго Банк выдаў 500 пазычак. І гэта называецца падкупам усей беларускае людпасьці! Гэта ёсьць непатрэбная апека над кожным пачынаньнем беларускага грамадзянства. Была тут вельмі цікавая экспэртыза Банку, зробленая пракурорам Раўзэ, які прыйшоў да выводу, што банкавыя сумы — гэта тая сума, якая была атрымана ў Гданску. Гэта вельмі дзіўная бугальтэрыя. Прак. Раўзэ казаў, што Коўш быў дрэнным бугальтэрам, бо яму перашкаджала тэолёгія. Я ня ведаю, што перашкаджала прак. Раўзэ зрабіцца добрым бугальтэрам, бо ён ёсьць дрэнным. Ня можна рэчаў, ня маючых супольнае меры, дадаваць, як напр. золата да людзей і пробаў да дзерава. Экспэрты сьцьвердзілі, што ніякіх фікцыйных запісяў ня было, а пракурор гэтаму ня верыць. Абвіненьне, што Банк паўстаў, каб падкупляць беларускую людпасьць, беспаваротна разьвяваецца. Пасьля праф. Пятрусэвіч абгаварвае справу кантакту з Банкам ў Рызе і зьбівае закіды, быццам вучні белар. гімназіі з віны Астроўскага вялі дэструкцыйную працу.

Квэстыю учасьця абв. Астроўскага ў гданскай канфэрэнцыі праф. Пятрусэвіч абгаварвае пры зачыненых дзьвярох.

Паны судзьдзі,—кажа праф. Пятрусэвіч па абвешчаньні яўнасьці—прыступаю да закідаў, пастаўленых абв. Шнаркевічу, Сакалоўскаму, Стоціку. Калі адкінуць паказаньне Бабіча, дык проці іх няма ніякіх закідаў.

Кім ёсьць Бабіч.

Асобу Бабіча добра ахарактарызаваў мой калега Сьмяроўскі. Бабіч, паны судзьдзі,—гэта натарычны ілгун. Ен ілжэ і ломіць прысягу на кожным шагу. Яго ўчасьце на курсах дывэрсантаў у Лошыцы, учасьце ў кангрэсе камінтэрну, у канфэрэнцыях польскае і белар. кам. партыі — гэта адзін беспярарыўны ланцуг маны. І я гэта з пачуцьцём адказнасьці падаю пракурорскаму ўраду. Бабіч выступае ў цэлым радзе працэсаў, але на Суд не зьяўляецца. Ен кажа аб сабе, што зьяўляецца будаўнічым — хіба што ў тым сэньсе, што будуе масавыя працэсы. Адносна да абв. Шнаркевіча, Сакалоўскага і Стоціка няма ня толькі доказаў віны, але навет падазрэньняў.

Абв. Луцкевіч.

Мая роля зьяўляецца тут і лёгкай і труднай. Не прадстаўлена проціў яго ніякіх закідаў. Ен быў усім у руху беларускім. Калі-б навет быў рэдактарам і часопісі канфіскавана за яго артыкулы, дык і тады яго можна-б было абвіняць толькі па 129 арт., але ніколі па 102 К. К. Луцкевіч да Грамады не належаў і пратэставаў проціў ідэнтыфікацыі яго асобы з Грамадой. Закідваецца яму ідэёвае кіраўніцтва, але тварцы ідэёвых рухаў, не бяручыя ўчасьця ў практычнай дзеяльнасьці, ня могуць быць пацягнуты да адказнасьці. Ці Леў Толстой, карыфэй анархізму, адказваў за свае ідэі? Луцкевіч, як неналежачы да Грамады, ня можа за яе дзеяльнасьць панасіць ніякае адказнасьці.

Луцкевіч ад 1922 г. зыходзіць з палітычнае арэны, бо хварэе на сухоты. Ен нездабываў сабе засобаў гандлем старасьвецкімі рэчамі. Пракурор казаў аб Луцкевічу, што ён зьяўляецца палякажэрцам, камуністым і г. д. Скуль пан пракурор узяў гэтыя дофініцыі? Усё гэта паходзіць з палемічнага артыкулу новае фармацыі беларуса—Рагулі, але пан пракурор не дачытаў гэтага артыкулу да канца, бо заканчэньне было гэткае: „Пане Луцкевіч, за тваю дзеяльнасьць Польшча паставіць табе памятнік, а народ белар. уб'ець кол у магілу". Гурын сцьвярджае, што сфэры камуністычныя адносіліся да Луцкевіча заўсёды варожа і хацелі яго пазбыцца.

Можа ён і зьяўляецца Макіявэльлем, можа навет бел. Бісмаркам, але за мыслі скрытыя ня можна судзіць. Калі аднаго разу рабілі рэвізію на граніцы ў валізцы Гэйнэ, дык ён сьмяяўся пасьля, што шукалі забароненых мысьляў, якіх ён мае поўную галаву, у валізцы. Або ізноў гэткія закіды, як што ў Луцкевіча знойдзена дзьве кніжкі, выданыя ў Сав. Расеі? Ці гэта праступак? Або ізноў гісторыя з эвангеліяй пабеларуску? Гэта-ж дапраўды жарт, які павінен знайсьціся ў „Cyruliku" або „Маланцы". Паны судзьдзі, хачу падзяліцца з вамі ўвагамі, якія мне насунуў пераклад праз праф. Глезэра кн. „Працэс Ісуса Хрыста. Мы прывыклі лічыць расьпяцьце Хрыста за морд. І вось дзіва! Працэс адбыўся пры спаўненьні ўсіх фармальнасьцей жыдоўскага права. Аднакжа ўся гісторыя, уся людзкасьць не сумляваецца, што зроблена вялікая памылка, што ўкрыжавана Бога.

У гэтых матэрыялах, якія сабраў цяперашні працэс, прышлы гісторык ня знойдзе праўды,—бо яе тут няма.

таўся з пісарам, даў знак, каб зціхлі і загаварыў.

— Есьць два кандыдаты—Дзяцел і Саковіч. Мне здаецца, што двох будзе досыць!

— Досыць! Досыць!—загудзелі пярэднія.

— Калі досыць, дык распачнём галасаваньне. Хто за старага старшыню—перахадзі направа, хто за Саковіча—улева!—скамандаваў земскі.

Для агулу Саковіч быў зусім ня ведамы чалавек і таму большасьць сялян стаяла ў нерашучасьці, ня ведаючы, што рабіць. Старшыновы хаўрусьнікі дружна рынуліся ўправа, цягнучы за сабой і частку нездаволеных. На левых Дзяцел злосна паглядаў і яго погляд, здаецца, хацеў прабіць кожнага; некаторыя ня вытрымалі яго і чалавек дваццаць перайшло, спусьціўшы галовы, направа. Земскі з пісарам лічылі. На Дзятлавай старане аказалася 128 чалавек, за Саковічам 74.

Чэцьверць гадзіны пасьля пісар ужо чытаў пратакол—...зкачнай большасьцяй галасоў аказаўся выбраным на старшыню Янка Дзяцел.

— Гура! радасна закрычэлі Дзятлавы прыяцелі. Земскі, мусіць, віншуючы, падаў Дзятлу руку, той ахвоча сьціскаў земскаму, пакланіўся і так радасна ўсьмяхнуўся, ажно канцы яго вусоў падняліся ўгору.

— Падпісвайце пратакол!—сказаў пісар, палажыўшы на краты паперыну і паставіўшы чарнільніцу. Старшыновы хаўрусьнікі сталі падпісваць, а нездаволеныя паадзявалі шапкі і сумныя, павешаўшы насы, выхадзілі на вуліцу. Там сабраліся ў грамадку і ціха гутарылі.

— Ня сталася-б гэдак, каб быў Вяршыла—уздыхнуўшы, сказаў адзін.

— Апрача яго ёсьць пэўных людзей, трэба было толькі згаварыцца загадзя.

— Я-ж і казаў гэта, а вы слухалі гэтых баснябаяў, вось і церабіце цяпер за вухам!

— „Ну, на другі раз не ашукаюць, прахвосты, будзем ведаць"!

— Ня так, то йначай, але ашукаюць зноў, браткі, нічога не парадзіш, калі за яго стаіць усё начальства. Калі-б мы і выбралі добрага чалавека, які шчыра нас бараніў-бы, то думаеце ён доўга праслужыў-бы? — прагналі-б, а то яшчэ пасадзілі-б у вастрог!

— „Праўду ты кажаш. Вяршылу во толькі хацелі яшчэ выбраць і то ўжо пасадзілі"!

— Праўда, то праўда, але што-ж нам рабіць? Так-жа-ж жыць ужо немагчыма, зусім замучылі!

— Трэба, сказаў хлапец гадоў 26-ці, каб на мейсцы старшыні, земскага, станавога і ўсяго, аж да самага верху, начальства, сталі-б нашы, стойкія людзі, тагды толькі можа паправіцца наша доля!

— А як-жа ты гэта зробіш, калі вось старшыню й то ня можам зьмяніць? —запыталі ў яго.

— Адзін ня зробіш, але грамада, мільёны працоўных лёгка гэта зрабіць могуць, трэба толькі дружна нам узяцца за гэту справу, не прадаваць адзін другога, ня грызьціся паміж сабой, як галодныя сабакі за костку і... трэба, каб яшчэ больш нас прыціснула гора...— неяк быццам саромячыся дакончыў хлапец сваю гарачую прамову.

У гэты момант выйшлі Дзятлавы сябры і грамадка сялян, убачыўшы іх, хутка растала, а яны, рагочучы, скіраваліся да Шмэркі спрыснуць выбары свайго „дабрадзея".

Доўга яны там мусіць „прыскалі", бо-ж і сьцямнела ўжо, а ў мястэчку чуліся яшчэ песьні і выкрыкі п'яных людзей.

П. Асана.

(Канец).

Справа урадавай амністыі для палітычных вязьняў.

Даўно ўжо існуе наша зямля, а на ей людзкае жыцьцё, якое падтрымліваецца толькі працай. Але кожнаму вядома, што ня ўсе людзі аднолькава працуюць. Перш яны рабілі ўсё самі, потым пачалі перакладаць працу на жывёлу, паняволячы яе, а потым і на паняволеных, пераможаных людзей, а ўканцы на машыны. Але кожная жывая істота ня можа доўга пражыць у працы ў няволі, і кожная жывёліна ўнікае яе, калі яна ня вырвецца з пад цяжару гэтай працы, або калі вызысківаючы яе прaможца (чалавек) не асвабодзіць яе на нейкі пэўны час, то яна перастае жыць, „здыхае ў хамуце", як кажа народ.

Так добра разумее жывёла інстынктам жыцьця значэньне для яе існаваньня свабоды!

Тое-ж робіцца і з людзьмі, толькі ў шмат большым маштабе, бо чалавек, апрача інстынку, мае і розум — здольнасьць — думаць, сьвядомасьць, праз якую ён бачыць пераж ытае, пэражываемае, а галоўнае, прадбачыць будучыню. Вось гэтая сьвядомасьць і ёсьць галоўнай адрозьніваючай рысай чалавека ад жывёлы, бо сьвядомы чалавек ня мае страху перад чалавекам, які мае жывёла. Гэта і ёсьць галоўная прычына імкненьня паняволенага чалавецтва, каб вызваліцца з пад вызыску такога-ж самага, як ён, чалавека.

І з таго часу, як у паняволенага чалавецтва зьявілася гэтая спружына — сьвядомасьць — пачалося яго змаганьне за вызваленьне з пад пануючых, вызысківаючых яго.

З таго часу турмы пачалі напаўняцца змагарамі за неабходную кожнаму свабоду і роўнае права на жыцьцё.

Але нішто ў жыцьці не стаіць бяз зьмены, усё йдзе пастуцова да свайго расцьвету, ці канца.

Так і гэтае змаганьне паняволеных з пануючымі ідзе паступова да свайго расцьвету і перамогі, бо яно, што далей, то больш узрастае ў сіле, асабліва праз узрост сьвядомасьці паняволеных, якая ў астатніх часох ўзрастае ня днямі, а гадзінамі, а то і мінутамі. Аб гэтым сьведчаць газэты.

Якую газэту ня ўзяць у рукі, ува усякай ёсьць аб розных „палітычных працэсах" ці то паасобных людзей, ці то цэлых грамадаў, як забастоўкі, ува ўсякай капіталістычнай дзяржаве. Ува ўсякай капіталістычнай дзяржажаве цяпер турмы перапоўнены змагарамі паняволеных, як іх называюць „палітычнымі вязьнямі", за роўнае права на жыцьцё пад сонцам. Значны ўзрост гэтых працэсаў і ў Польшчы.

І што тут кідаецца ў вочы, то гэта тое, што гэтая страшная эпідэмія утраціла спэцыфічныя прыметы розных эпідэміяў: хуткасьць, кароткасьць іх жыцьця ў здаровым арганізьме, а яна ў сучаснай буржуазіі Польшчы перайшла ў хранічную хваробу, і ўсё больш і больш змагароў з працоўных гушчаў садзіцца ў турмах за роўнае права на жыцьцё працуючых, як і не працуючых.

Але і працоўныя масы ніколі не адракаюцца тых, хто іх не адрокся.

Працоўныя масы заўсёды помнілі і помняць аб сваіх змагарох і заўсёды даюць ім помач, як матэр'яльную так і маральную і апрача гэтага дамагацца для іх амністыі.

І на першым-жа паседжаньні Польскага Сойму быў падапы да яго (Сойму) праект амністыі для палітычных, які Сойм прыняў большасьцю галасоў.

Але ўраду не спадабалася гэта, як не падабаецца буржуазіі наагул і ўсякае палепшаньне, якога працоўныя дапінаюцца самі.

І ўрад захацеў сам даць гэтую „благадаць", з мэтай чаго і падаў у Сойм свой праект амністыі.

Ці-ж гэты ўрадавы праект ёсьць запраўды „амністыя дэмакратычнай дзяржавы сваім палітычным вязьням", ці толькі даўнейшы царскі маніфэст: „мёртвым свобода—жывых под арест", убачым самі, прагледзіўшы яго зьмест. А зьмест яго гэтакі:

„Для ўпамятаваньня 10-годзьдзя незалежнасьці Польшчы даруюцца наступныя кары:

1) Даруюцца праступствы, папоўненыя ў 1918—19 годах на абшарах Львоўскага, Станіславоўскага і Тарнопальскага ваяводзтва, ў часе збройнай барацьбы.

2) Праступствы, папоўненыя ў 1918, 1919 і 1920 гадох на абшарах, дзе абавязвае расейскі карны закон, з 100 і 110 арт. (бунт проці ўлады і здрада) і іншыя збройныя праступствы проці Польшчы.

Не даруецца забойства пры распаўсюджываньні ідэі камуністычнага перавароту.

3) Даруецца траціна ($^{1}/_{3}$) кары засуджаным за распаўсюджваньне ідэі камуністычнага ладу, калі праступствы зроблены перад днём 3 траўня 1928 году і калі праступніку да гэтага дня, (3.V 28 г.) ня споўнілася 17 гадоў.

Амністыя ня тычыцца: няпольскіх грамадзян, праступнікаў за камуністычную дзейнасьць у войску, калі кара большая за 4 гады.

Бестэрміновая турма замяняецца на 15 гадоў, а кара сьмерці — на дасьмяротную турму".

I ўсё для палітычных вязьняў (далей ідуць адміністрацыйныя і прэсавыя кары).

Як бачым, дык гэтая амністыя дае палёгку толькі непаўнагоднім вязьням, якіх найменей. Рэшта ж беларускіх палітычных вязьняў будзе сядзець, бо сьмела можна сказаць, што ўсім ім закідаецца камунізм.

З палітычных вязьняў-жа з 1918, 1919 і 1920 гадоў не скарыстае хіба ніхто, бо яны ўжо або адсядзелі сваю кару, або паўміралі ў турмах.

I вось праект такой амністыі 24 траўня г. г. прыняла з маленкаю папраўкаю спэцыяльная падкамісія, утвораная дзеля гэтага з праўнай соймавай камісіі.

Ці ж не задалёка тут пашла „адлега" ў сродках змаганьня і ў самым значэньні буржуазіі з яе палітычнымі праціўнікамі — з працоўнымі?!?

Пішуць, што ў соймавай камісіі гэты праект прыняты з нязначнымі папраўкамі.

Дык што-ж тады Сойм?

Хатняя вайна у Кітаі.

Дыпляматычны канфлікт СССР з Японіяй.

22-га траўня Чычэрын у гутарцы з журналістамі высьвятліў стасункі радавага ўраду да аружнага ўмяшацельства Японіі ў Кітаі.

Ен заявіў: „Тыя, хто сачыць за палітыкай радавага ўраду ў працягу 10 гадоў яго існаваньня, добра зразумеюць, што гэты ўрад ня можа адобрыць проста ці пасярэдня нейкую чужаземную інтэрвэнцыю (ўмяшаньне) ці ваенную акупацыю наагул, а асабліва — адносна кітайскага народу". Далей, абгаварваючы становішча вялікіх дзяржаў у кітайскай справе, Чычэрын заявіў: „Мірныя прамовы дэлегатаў дзяржаў у Лізе Народаў, гэта—адно, а факты ваеннай інтэрвэнцыі ўрадаў тых-жа дзяржаў, гэта—што іншае. Але-ж факты — мацнейшыя, як словы. Дзеля таго гэтыя мірныя прамовы, якія афіцыяльна гаворацца, не выклікаюць ужо ніякага да сябе даверыя".

Надрукаваная ў „Известиях" гэтая гутарка Чычэрына, зьмяшчаючая яўную перасьцярогу па адрасу Японіі, выклікала цэлую „буру абурэньня" ў японскіх урадавых колах. Японскі прэм'ер Танака—у зьвязку з гэтым—меў даўжэйшую гутарку з радавым паслом Траяноўскім, якому, як паведамляюць з Токіо, заявіў, што вельмі вострм тон заявы Чычэрына ў стасунку да Японіі „можа ўплывуць вельмі дрэнна на далейшае разьвіцьцё стасункаў паміж абодвума краямі". Японскі прэм'ер думае, відаць, што „лагодная" акупацыя японскімі войскамі ўсей Манчжурыі, якая, паміма гвалту над прыязнай з СССР Кітайск. дзяржавай, зачэплівае і жыцьцёвыя інтарэсы СССР, менш дрэнна ўплывае на гэтыя „стасункі між абодвума краямі", як „вострыя заявы", выкліканыя гэтай акупацыяй.

Перад рашучым боем дзьвюх арміяў у Кітаі.

Пэўне-ж—не бяз скрытай дапамогі японцаў Чанг-Тсо-Ліну ўдалося неяк затрымаць на якісь час фарсаванае наступленьне з двох бакоў на Пэкін і Цянь-Дзін ген. Фэнга і Чанг-Кай-Шэка. На фроньце ваенных падзей запанавала часовая перадышка. Чанг-Тсо-Лін чыніць усе высілкі, каб, як мага, украпіць падступы да абодвух найважнейшых местаў паўдзённага Кітаю, якіх здабыцьцё адкрыла-б браму да яго апошняга „кута" — Манчжурыі. Як ведама, японскі ўрад заявіў, што лічыць Манчжурыю выключанай з тэрыторыі, на якой можа іосьці вайна... дык — заняў яе фактычна цалком сваімі войскамі. Чанг-Тсо-Лін сам, аднак-жа, ня вельмі лічыць на свае сілы, дык шпаркая эвакуацыя Пэкіна і Цянь-Дзіна ідзе ўсьцяж. З свайго боку ўкрапляюцца чужаземнымі атрадамі і эўрапэйскія кварталы абодвух местаў, пэратвараючыся ў запраўдныя крэпасьці. Весткі аб заняцьці авангардам ген. Фэнга прадмесьця Пэкіну аказаліся перадчаснымі. Войска Фэнга яшчэ ў адлежнасьці каля 50 кілям. ад Пэкіну. У Пэкіне ўжо называюць Фэнга першым кандыдатам на становішча кітайскага прэм'ера. Кандыдатура Чанг-Кай-Шэка — пасьля яго капітуляцыі пад Тсі-Нан-Фу, значна аслабела.

Манголія „цікавіцца" справай Манчжурыі.

У зьвязку з японскай акупацыяй Манчжурыі — 2 конныя дывізіі мангольскай арміі—пад камандай радавых афіцэраў—падсунуты да граніцаў Манчжурыі.

Пагроза Японіі Чанг-Тсо-Ліну.

Японскі ваенны паўнамочнік у Пэкіне заявіў Чанг-Тсо Ліну, што—кожны атрад яго арміі, які, адступаючы з фронту, пяройдзе граніцу Манчжурыі ў стане дэмаралізацыі, будзе безадкладна разброены японскімі войскамі...

Ведама-ж,—вельмі лёгка японскаму камандаваньню разглядаць кожны атрад паўночнай арміі, як здэмаралізаваны, навет калі-б гэтага і ня было, каб цалком пазбавіць ад кітайскіх войскаў Манчжурыю. Ясна, што Японія не давярае навет Чанг-Тсо-Ліну, які таксама пратэставаў проці яе гвалтаў над кітайскай тэрыторыяй.

З Порту-Артуру ў Мукдэн.

Японскае камандаваньне перанесла сваю галоўную кватэру з Порту-Артуру ў Мукдэн, сцьвердзіўшы гэтым выразна ваенную акупацыю манчжурскай сталіцы і ўсяго краю.

Адказ Пэкінскага ўраду на амэрыканскую ноту.

На ноту амэрыканскага ўраду, пратэстуючую проці забойстваў амэрыканскіх місыянэраў у Кітаі, Пэкінскі ўрад адказаў, што бярэ на сябе адказнасьць за бясьпечнасьць чужынцаў, аднак жа заявіў адначасна пратэст проці высыланьня чужаземных войскаў у Кітай, што пярэчыць міжнародавым звычаям.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Польска-літоўскія перагаворы.

Польска-літоўская камісія, працуючая ў Бэрліне ў справах урэгуляваньня прыгранічнага руху, з усіх іншых камісіяў зрабіла найбольш і найхутчэй. Камісія прыняла, з малымі зьменамі, літоўскі праект так званай „малой камунікацыі „гранічнай". Гэты пасьпех лічыцца значным шагам на шляху тэхнічнага паразуменьня між абодвума краямі. 25 траўня падкамісія мела закончыць сваю працу.

Цікаўна, што літоўская дэлегацыя цалком адкінула польскі праект гранічнай камунікацыі, але высунула свой контр-праект, які і быў прыняты. Камісія для справаў гаспадарчых, камунікацыі і транзыту, працуючая ў Варшаве, распачала паседжаньні 23 траўня. Падкамісія выдала камунікат, у якім кажа, што яна падзялілася на падкамісіі: чыгункавую, паштовую і гаспадарчую.

Польска-літоўская канфэрэнцыя ў Варшаве.

У суботу 26 г. м. закончыліся польска-літоўскія перагаворы ў Варшаве ў справе эканоміі, камунікацыі і транзыту. Справаздача падкамісіяў ў гэтых справах выявіла, што ні ў адной з іх ні асягута ніякага паразуменьня.

Усе дыскусіі маюць быць пачаты на наступным паседжаньні, якое пачнецца 28 чэрвеня г. году.

Забастоўка ў цагельні і лесапілцы.

У цагельні „Obory" ў Езёрне, пад Варшавай, кінула працу 100 работнікаў, жадаючы 33 працэнты падвышкі.

Таксама на эканамічным груньце выбухла забастоўка ў лесапілцы Рубіна Найзэра ў Фаленіцы. Работу кінула больш 50 чалавек.

Жаданьні Лодзкіх трамвайнікаў.

Лодзкія трамвайныя работнікі зажадалі падвышкі 25 прац. платы і выплаты трэцяй гратыфікацыйнай (нагароднай) платы, у суме 10 тыднёвага заработку.

Тэрмінам рэалізацыі гэтых жаданьняў вызначаны дзень 1 чэрвеня г. году.

Фабрычныя майстры ў Лодзі пастанавілі патрэбаваць 20 працэнтоў падвышкі платы і дамагацца скліканьня супольнай канфэрэнцыі з прамыслоўцамі ў найбліжэйшым дні.

Падвышкі ў гандлі.

Арбітражова-паяднаўчая камісія ў Катавіцах прызнала для гандлёвых работнікаў Верхняга Шлёнску 10 прац. падвышкі платы.

Прыгавар над камуністкай.

Акружны суд у Сасноўцы прыгаварыў на год цяжкага вастрогу сябра саюзу камуністычнай моладзі Шпрыцу Штымер за „антыдзяржаўную дзеяльнасьць".

Шпігоўская „афера" ў Львове.

Як падаюць газэты, паліцыя выкрыла, быццам, шпігоўскую арганізацыю ў Львове, у якой бралі ўдзел і ўкраінскія дзеячы. У сувязі з гэтым арыштавана некалькі асобоў, а сярод іх і дзеячоў—Чулоўскага, Антося і Пятра Гаеўскіх.

Градавыя буры ў Вялікапольшчы і на Валыні.

Гэтымі днямі над Вялікапольшчай (Пазнань) пранеслася вялікая градавая бура, прычыніўшая страшэнная школы, бо зьнішчыла цэлыя абшары пасеваў. У некатарых мясцовасьцях вялічыня граду даходзіла да велічыні італьянскіх гарэхаў і град пакрыў зямлю таўшчыней у 10 сантымэтраў.

У тым-жа самым дні (24 г. м.) пранеслася грозная градавая бура над Крамянецкім паветам на Валыні, зрабіўшая там дужа вялікія страты. Град даходзіў да велічыні курынага яйца. У некаторых воласьцёх град зьнішчыў ад 50 да 70 прац. пасеваў (як азіміны, так і ярыны), а ў другіх засевы зьнішчаны да 100 працэнтаў. У часе буры град пакрыў зямлю таўшчынёй у 8 сантымэтраў, а вада даходзіла да вышыні паўтара мэтра. Гэтая вада спаласкала ворную зямлю, пакінуўшы толькі камяністае падглебы, а нізкія месцы занясла мулам, вапнай і дробным каменьнем.

Заграніцай.

Новыя замовы радавага ўраду ў Англіі.

Радавы ўрад зрабіў у Англі замовы — на 25 мільёнаў залатых рублёў — на ткацкія і электрычныя машыны. Гэта — першая буйнейшая замова радавага ўраду ў Англіі—ад часу разрыву стасункаў. Дык, можа—чарговы крок да падрыхтаваньня іх узнаўленьня.

Выбары ў Прускі Сойм.

На выбарах у Прускі Сойм сацыялісты таксама здабылі значную перамогу і перавагу над буржуазнымі партыямі. Вось склад новага Сойму—у параўнаньні з папярэднімі.

Сацыял-дэмакараты здабылі — 136 ман, мелі—114 у папярэднім; нацыяналісты—82, мелі—109; камуністы—55, мелі—44; цэнтр—69, мелі—81; дэмакраты—21, мелі—97; людоўцы—40, мелі—45; гітлераўцы—6, мелі — 11; „гаспадарч. партыя"—21, мелі — 11; дробн. правыя групы—14 мелі—0; польская меншасьць мандату не здабыла.

Які-ж урад створаць сацыял-дэмакраты ў Нямеччыне.

Цікавую ілюстрацыю да гэтых заяваў „Форвэрста" даюць весткі ды чуткі аб тых перагаворах, якія ўжо падрыхтоўваюцца паміж партыямі — у справе стварэньня новай коаліцыі (супрацоўніцтва) ў парляманьце і новага ўраду.

Сацыялісты заявілі, што бяруць на сябе стварэньне новага ўраду — на падставе такзванай „вялікай коаліцыі", гэта значыць, што ў склад урадавай большасьці ў парляманьце маюць, апрача сацыял-дэмакратаў, увайсьці — партыі: каталіцкага цэнтру (клерыкалы), дэмакратаў (дробная і сярэдняя буржуазія) і так зван. „людоўцаў Штрэзэмана" (буйная мястовая буржуазія). А гэтыя „людоўцы" цягнуць за сабой у „сацыялістычны" габінэт, як варунак свайго ўваходу ў склад ураду, і так званыя „гаспадарчыя колы", ці „партыю гаспадарчую" (найбуйнейшую буржуазію), якая, як падчырківаюць „людоўцы", „выказывае вялікае жаданьне да стварэньня супольнай плятформы з сацыялістамі" (гл. тэл. „Усх. Аг."). Калі такая коаліцыя — пад старшынствам сацыял-дэмакратаў, дык запраўды рыхтуецца дзіва, што іх партыйны орган „Форвэрст" лічыць камуністаў—„адзінай перашкодай для пралетарыяту, з якой аднак-жа сацыялісты дадуць сабе рады"...

Орган нямецкіх сацыял-дэмакратаў аб перамозе сацыялізму ў Нямеччыне.

Орган нямецкай сацыял дэмакратыі „Форвэрст" піша, што апошвія выбары даказалі ясна, што магчымасьць здабыцьця ўлады сацыялістамі ў Нямеччыне — шляхам дэмакратычным — ня ёсьць навет залішне далёкая. Апошнія выбары далі сацыялістам каля 30 проц. галасоў і мандатаў. Лічба гэта ўсьцяж расьце. Дык можна спадзявацца, што прышлыя выбары дадуць сацыялізму звыш паловы мандатаў, што азначала-б панаваньне сацыялізму легальным парляментарным шляхам.

А гэта азначае, піша газэта, банкруцтва прынцыповай тэзы камуністаў, якія запярэчваюць, што шлях дэмакратыі вядзе да сацыялізму. Дык—„адзінай перашкодай для пралетарыяту на гэтым шляху зьяўляюцца камуністы", кажа „Форвэрст".

У справе новага нямецкага ўраду.

24-га траўня адбылося паседжаньне нямецкага ўраду, які — у паразуменьні з прэзыдэнтам Гіндэнбургам—пастанавіў — ня выходзіць пакуль-што ў адстаўку,—да дня адчыненьня новага парляманту. Новы парлямант мае сабрацца 12-га чэрвеня, дык урад Маркса мае зложыць уладу 11-га чэрвеня.

Нямецкая прэса прадбачыць, што пасьля адстаўкі кабінэту Маркса прэзыдэнт даручыць стварэньне новага ўраду павадыру найлічнейшага сацыял-дэмакратычнага клюбу ў Рэйхстагу (парляманьце) пас. Мюллеру.

Нарада польскіх камуністаў у Бэрліне.

У Бэрліне паліцыя накрыла нараду польскіх камуністаў, у якой прымаў учасьце быццам і пасол Сахацкі. Учасьнікаў нарады паліцыя арыштавала — з прычыны няменьня дазволу на прыезд у Нямеччыну і фальшывых пашпартоў. Частка ўчасьнікаў нарады выслана з Нямеччыны зараз-жа—пасьля канца сьледзтва, частка сьпярша адпакутуе за парушэньне нямецкіх законаў. Так даносяць тэлеграмы.

„Гаспадарчы" захват Балканаў Італіяй.

Вялікую ўвагу зьвярнуў на сябе апрацаваны Італіяй плян будовы чыгункавага шляху, злучаючага альбанскі порт Дураццо з Канстынтанопалем. Шлях меў бы праходзіць праз Альбанію, Грэцыю і Турцыю. У зьвязку з гэтым плянам ставяць апошнія трактаты гэтых дзяржаў з Італіяй. Быццам ужо стварыўся сындыкат (кампанія) фінансістаў, — дзеля выкананьня гэтага пляну. На чале кампаніі — пэўне ж стаяць італьянскія фінансісты.

Газэты слушна разглядаюць гэты плян чыгункі, як далейшы крок у пляновым апанаваньні Балканаў Італіяй.

Прысуд у справе эльзаскіх аўтанамістаў.

Пасьля 20-дзённай расправы 24-га траўня скончыўся ўрэшце працэс эльзаскіх аўтанамістаў. Як ведама, пракурор закідаў падсудным, з доктарам Рыклінам на чале,—„імкненьне да адарваньня правінцыяў Эльзаса і Лётарынгіі ад Францыі — згодна з загадам з Бэрліну" і г. д. Мы ня маем пакуль-што дакладнай справаздачы з гэтага характэрнага наагул для пасьля ваеннага часу працэсу. З прысуду аднак-жа можна заключыць, што суд прызнаў прынцыпова віну падсудных у „здрадзе стану", але прыняўшы пад увагу шмат „лагодзячых абставінаў", засудзіў толькі 4 павадыроў аўтанамічнага руху на 1 год вастрогу, — з пазбаўленьнем грамадзкіх правоў на 5 гадоў. Рэшту абвінавачаных суд апраўдаў. Эльзаскіх „краёўцаў", ці, з пагляду францускіх цэнтралістаў—„здрайцаў стану" ды „нямецкіх агентаў", судзіў суд прысяжных, ці суд грамадзянскага сумленьня. Дык навет—пэўне ж—у значнай меры падабраны францускай уладай склад лаўкі прысяжных усё-ж прыняў пад увагу „лагодзячыя абставіны".

Навая Канстытуцыя Літоўскай Рэспублікі.

24-га траўня прэзыдэнт у паразуменьні з ўрадам і дзяржаўным кантралёрам — аканчальна зацьвердзіў новую канстытуцыю літоўскай рэспублікі. Паводле новай канстытуцыі—прэзыдэнт выбіраецца на 7 гадоў, а Сойм—на 5 гадоў. У часе перарываў працы парляманту прэзыдэнт мае права—выдаваць дэкрэты з сілай законаў, прымаць і выконваць бюджэт, зацьвярджаць міжнародныя ўмовы. Гэта значыць—цалком заступаць парлямант, які прэзыдэнт пэўне-ж можа і распускаць у любы мамэнт.

Габінэт міністраў салідарна адказвае перад Соймам і выходзе ў адстаўку, калі Сойм—большасьцю $^{3}/_{5}$ галасоў выразіць яму недаверые. Зьмена канстытуцыі можа быць дакавана пастановай—тэй самай большасьці. Сталіцай Літвы зьяўляецца Вільня. Але сталіца можа быць часова перанесена ў іншае места—спэцыяльным законам.

Выбары ў Сойм адбываюцца на падставе агульнага, роўнага, простага, тайнага і прапарцыянальнага галасаваньня. Правы голасу маюць усе асобы, скончыўшыя 24 гады (амаль ня ўсюды на сьвеце—ад 21 года—ад часу агульнага паўналецьця). Быць выбраным у Сойм грамадзянін можа толькі маючы 30 гадоў. Для падрыхтаваньня законаў ствараецца Дзяржаўная Рада.

Новая канстытуцыя ўваходзіць у жыцьцё з днём яе апублікаваньня, якое мела адбыцца 26-га траўня.

Як бачым, канстытуцыя—у значнай меры рэакцыйная, а перадусім дае выканаўчай уладзе ўсе магчымасьці — ня лічыцца зусім з заканадаўчай палатай.

Вальдэмараса прыняў англійскі кароль.

З Лёндану даносяць, што пасьля доўгіх гутарак з Чэмбэрленам і прэм'ерам Балдвінам Вальдэмарас быў прыняты англійскім каралём. Польскія газэты даведаліся, быццам і англійскія міністры і сам кароль усялякімі спосабамі націскалі на Вальдэмараса, каб ён паразумеўся з Польшчай. Ня ведама вось толькі, што адказаў ім Вальдэмарас. Можа-ж толькі адно слова: Вільня.

Забастоўкі ў Індыі.

У Індыі ня спыняюцца забастоўкі, хваля якіх распачалася ў зьвязку з пратэстам індусаў проці накіданай краю англійскай „канстытуцыйнай камісіяй" парлямэнцкай рэформы—паміма голасу і бяз учасьця індускіх палітычных партыяў. Новая хваля забастовак, як даносяць з Калькутты, мае „выключна эканамічны характар".

Выбухі газаў у амэрыканскіх капальнях: сотні ахфяраў.

У Амэрыцы ў капальнях вугальля — з прычыны выбуху газаў—заваліліся шахты, у рэзультаце—82 вуглякопы забіта і 115 дагэтуль ня знойдзена. Другі выбух каштаваў жыцьця 15 гарнякам.

Грамадзяне! Памажэце пагарэльцам!

Вёска Скіпоравічы, Казлоўскае воласьці перад сьвятамі, а вёска Акунінава, Дзявяткаўскае воласьці ўжо пасьля сьвят зьнішчаны пажарам. Пажары былі такія страшныя, што навет ёсьць і людзкія ахвяры.

Дык грамадзяне! памажэце сваім няшчасным братам! Ня дайце іх дзеткам распаўзьціся з торбамі па сьвету! Складайце ахвяры, хто чым можа, і адвозьце пацярпеўшым. Гурткі Т-ва павінны ў найбліжэйшым часе паставіць па аднаму спэктаклю на карысьць пагарэльцаў, даход ад якога можна пераслаць і праз Акружную Управу.

Слонімская Акружная Управа.
Слонім, Ражанская 55.

Да беларускага грамадзянства і беларускіх установу у краі і заграніцай.

Адозва Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні.

Кожны, хто быў у Вільні ці жыве ў Вільні, калі заходзіў у Беларускія культурна-асьветныя ўстановы, то мусіў пераканацца, што жыцьцё гэтых установ не такое лёгкае, а вонкавы выгляд іх не такі прынадны. Прычын да гэтага трэба шукаць у дрэнным матэрыяльным стане і ў няспрыяючых для разьвіцьця беларускіх культурна-асьветных установ варунках. Кожная такая ўстанова мусіць плаціць вельмі дорага за памяшчэньне, часамі і зусім не адпаведнае, але ўзятае дзякуючы таму толькі, што сходнае па цане; вельмі часта тая ці іншая ўстанова перажывае цэлыя судовыя працэсы за памешканьне і стаіць перад магчымасьцю выкіненьня на брук (Віленская Беларуская Гімназія, Белар. Навуковае Т-ва, Беларускі Музэй). А гэта-ж добра ведама, што пазбаўленьне адпаведнага будынку такіх установ, як Гімназія ці Музэй роўнасільна зачыненьню іх. Такім чынам высілкі некалькігадовай працы могуць пайсьці за нішто ў адзін дзень, і награмаджаныя гэтай працай беларускія культурна-навуковыя цэннасьці могуць загінуць. І гэта ўсё робіцца ў Вільні, у гэтым найвялікшым цэнтры нацыянальнага і культурнага жыцьця Заходняй Беларусі! У гэтай Вільні ніводная беларуская ўстанова ня мае свайго ўласнага будынку, ня то што адпавядаючага заданьнем яе, але ніякага будынку ня мае!

Але з усіх установ найбольш цярпіць з прычыны адсутнасьці свайго ўласнага адпаведнага будынку Беларускае Навуковае Т-ва ў Вільні і Белар. Музэй пры ім. І мала таго, што цярпіць, далейшае трываньне такога стану рэчаў можа прывясьці да поўнай катастрофы Белар. Навуковага Т-ва, а асабліва Музэю.

Т-ва мае свой цэнны кнігазбор, бібліятэку, Беларускі Музэй мае шмат экспанатаў, вельмі цэнных і вельмі рэдкіх і багацейшую бібліятэку беларусазнаўства... І ўсе гэтыя рэчы, надзвычайнай цэннасьці, ляжаць зьвязаныя і запакаваныя ў пяці пакоях цяперашняга памешканьня, сырога і няпрыдатнага. Такім чынам цяперашні Музэй прадстаўляе сабою ня музэй, а склад музэйных рэчаў, зваленых і запакаваных і то хутка ўжо ня будзе дзе класьці новапаступаючых экспанатаў, якія прыбываюць з кожным днём і з усіх бакоў. У такім самым стане знаходзіцца і беларускі архіў. Такім чынам музэйныя і архіўныя цэннасьці, ня толькі ня могуць быць даступны грамадзянству, але яны ў такім стане нішчацца, бо звалены ў цесным сырым і неадпаведным памешканьні.

Але-ж Беларускае Навуковае Т-ва ў Вільні працуе ня дзеля таго, каб сабраныя ім музэйныя і архіўныя экспанаты і бібліятэкі прадстаўлялі сабой музэйна-архіўны склад, яно працуе дзеля таго, каб з гэтых экспанатаў утварыць музэй, архіў і бібліятэку, даступную для грамадзянства і дзеля навуковых мэтаў. І калі да гэтага часу Т-ва не зрабіла музэю-бібліятэкі і архіву даступнымі для грамадзянства і навуковых дасьледчыкаў—дык толькі дзеля таго, што ня мела адпаведнага на гэта памяшчэньня і сродкаў, патрэбных на арганізацыю.

А ўжо найвышэйшы час правясьці ў жыцьцё гэтыя праекты. Дзеля гэтага Белар. Навуковае Т-ва на сваім апошнім сходзе пастанавіла: зрабіць усе высілкі, каб набыць адпаведны ўласны будынак дзеля ўспомненае мэты. Само Навуковае Т-ва зьяўляецца за-надта беднай ўстановай, каб магло пабудаваць ці купіць адпаведны будынак. Але што ня змогуць адзінкі, чаго ня зможа адна арганізацыя, то зможа грамадзянства, увесь беларускі народ.

Дзеля гэтага Белар. Навуковае Т-ва пастанавіла зьвярнуцца з заклікам да ўсіх беларускіх культурна-асьветных установ, да ўсіх працаўнікоў на ніве беларускай культуры, да ўсіх спачувальнікаў разьвіцьцю беларускай культуры, да ўсяго беларускага грамадзянства, да ўсяго беларускага народу! Калі Беларускае Навуковае Т-ва ня можа пабудаваць ці набыць свайго ўласнага дому, Дому Культуры—дзе-б месьціўся і музэй і бібліятэка і архіў, хай сам народ сам сабе пабудуе такі „Дом Беларускае Культуры" ў адным з найвялікшых сваіх культурных і нацыянальных цэнтраў—у Вільні. Заграніцай можна вельмі часта спаткаць грамадзкія і культурна-асьветныя будынкі з надпісам: „Народ сам сабе". Дык ці-ж ня могуць беларусы здабыцца на адзін з такіх будынкаў у Вільні—„Дом Беларускае Культуры"?

І тутэйшыя беларусы, з Заходняй Беларусі і беларусы з Усходняй Беларусі і беларусы на эміграцыі ў Эўропе і ў Амэрыцы і іншых краях, усе, у каго ёсьць хоць крыху сьвядомасьці патрэбы разьвіцьця беларускае культуры, мусяць ахвяраваць хоць што-небудзь на вялікую справу!

Ні межы, ні найвялікшыя прасторы, аддзяляючыя ад Вільні, ні розьніца палітычных перакананьняў—ня могуць быць перашкодай у такой вялікай і сьвятой справе, усе, хто колькі можа, ахвяруйце і прышліце.

Усе Беларускія арганізацыі і ўстановы просім зьвярнуцца да сваіх супрацоўнікаў і сяброў з прапановай адлічаць пэўны працэнт на Дом Беларускае Культуры ў Вільні.

Асоб, прачытаўшых гэту адозву, просім споўніць гэты неадкладны грамадзкі абавязак, а адозву перадаць сваім суседзям і знаёмым, заахвочваючы іх зрабіць тое-ж самае.

Усе Беларускія часопісі і газэты просім перадрукаваць гэту адозву і памагчы такім чынам пашырыць яе ў белар. грамадзянстве.

Справаздачы аб паступленьні ахвяр на „Дом Беларускае Культуры ў Вільні" ад часу да часу будзем даваць у беларускіх газэтах і часопісях.

Ахвяры просім скіроўваць на адрас: Wilno, Wileńska 8, Białoruski Bank Kooperacyjny, konto № 17.

Увага: Ахвяры, прысланыя на „Дом Беларускае Культуры ў Вільні", будуць ляжаць у Беларускім Каапэратыўным Банку да часу, пакуль не налічыцца сума, патрэбная дзеля куплі ці пабудовы адпаведнага дому.

Наша хроніка.

Яшчэ адзін прыгавор над былым паслом „Грамады" Валошыным. Адначасна з судом над „Грамадой" у Вільні, які прыгаварыў б. пас. Валошына на 12 гадоў цяжкага вастрогу, Акружны Суд у Беластоку разглядаў справу памянёнага б. пасла за прамову, якую Валошын сказаў у 1926 годзе на з'арганізаваным ім вечы ў Саколцы, на якім і быў пабіты паліцыяй. Справа разглядалася завочна і Акружны Суд прыгаварыў Валошына на 1 год турмы.

Павятовыя зьезды сяброў Т-ва Б. Ш. 24 траўня адбыўся зьезд сяброў Т-ва Б. Ш. ў Навагрaдку, 27 траўня — ў Баранавічах. Падробную справаздачу дамо ў наступных нумарох.

Пэдагогічная Рада В. Б. Г. на паседжаньні 27 траўня ўхваліла рабіць 2% адлічкі з пэнсіяў на Дом Беларускай Культуры.

Ці ня хочуць выкурыць Музэй імя Ів. Луцкевіча? У нядзелю 27 г. траўня пад час агледзінаў Музэю гр. Антонам Луцкевічам было заўважана, што адкульсьці з-пад падлогі ідзе дым, які што раз больш напаўняў памяшчаньне. Дасьледжана, што гэты дым ідзе з пакою, які знаходзіцца пад Музэем. Аказваецца, што там знаходзіцца лёкатар б. Студніцкага, вядомага беларусаеда, які так нефортунна выступіў сьведкай проці гр. А. Луцкевіча і які ў свой час „адваяваў" памяшчэньне праз улады ад беларускіх культурных установаў, пасадзіўшы туды, невядома для якой мэты, названага лёкатара.

У час агледзінаў Музэю ў гэтага панка паліліся ў печы, пастаўленай якраз пад Музэем.

Трэба сказаць, што дым гэта ня першы раз, а ўжо ад доўгага часу запаўняе Музэй і ад яго закапцелі і пачалі псавацца найлепшыя музэйныя каштоўнасьці, але да апошняга часу не ўдалося „накрыць" віноўніка.

На гэты раз п. лёкатар Студніцкага запытаны—ці ведае, што ён такое робіць і ці не спыніўся б з паленьнем у печы—адказаў: „якое мне там дзела да вашых музэяў"?

Каб спыніць запраўднае барбарства, былі пасланы ў І камісарыят паліцыі пасланцы для зрабленьня сьледзтва і пратаколу. Але...

І камісарыят паліцыі адмовіўся пайсьці на месца.

Прышлося зрабіць пратакол самім прысутным у музэі з сваімі толькі подпісамі.

Гэту справу пэўна-ж разгледзіць Суд, бо запраўды-ж такое барбарства—проста немагчымае, а, калі магчымае, то толькі да падобных Студніцкім, які, ведаючы музэйную справу, садзіць пад Беларускім Музэем чалавека, які ў цячэньні доўгага часу проста нішчучы Музэй, і робячы яўны праступак, адказваецца навет гаварыць.

Неадбыты мітынг. У панядзелак 28 траўня па запрашэньню ППС-лявіцы пасол клюбу „Змаганьня" Я. Грэцкі меў зрабіць справаздаўчы мітынг у Вільні. Была нанята саля і расклеены па месьце афішкі. У 12 гадзін пачалі зьбірацца работнікі да памяшчэньня. Мітынг меўся адбыцца ў закрытым памяшчэньні, на які, згодна папярэдніх інфармацыяў, асобнага паведамленьня паліцыі ня трэбуецца. Аднак, паліцыя не дапусьціла работнікаў у памяшчэньне, дзе меў прамаўляць, заместа захварэўшага пасла Я. Грэцкага—пас. Я. Гаўрылік, матывуючы тым, што мітынг нелегальны.

З судоў у Навагрaдчыне. 17-га чэрвеня гэтага году выязная сэсія Апэляцыйнага Суда ў Вільні будзе разглядаць у Навагрaдку справу А. Кішкеля, Бярэзіна, Іванцэня, Лаксіня, Ціхана, Лойкі, Мініча, Ганчароўскага, Малькі, З Станкевічанкі і іншых, у ліку 18 чалавек, абвінавачваных з 102 арт. К. К. за прыналежнасьць да Акружнога Камітэту „Камуністыч. Партыі Зах. Беларусі".

Апэляцыйныя суды палітычных ў Вільні. Газэты падаюць аб цэлым радзе апэляцыйных судоў палітычных, якія прыпісваюць да пасьледзтваў дзеяльнасьці „Грамады", або „Wielkiego Mistrza.

Напрыклад. Былы солтыс вёскі Глінна, Столінскага павету, падаваў апэляцыю ў справе прысуду яго на 1 год турмы, за тое, што ён, быццам, агітаваў (з намовы „Грамады", кажуць панскія газэты), каб сяляне не плацілі падаткаў.

Апэляцыйны Суд гэты прыгавар зацьвердзіў.

Таго-ж самага дня Апэляцыйны Суд у Вільні зацьвердзіў кару 3 гадоў турмы для слухача польскага віленскага унівэрсытэту, нейкага Бэньяміна Цукермана.

Паменёны папярэдня прыгавораны судом на гэтую кару за „камуністычную" дзеяльнасьць, а іменна, за тое, што Цукерман у часе маніфэстацыі на вуліцы Пілсудскага сказаў прамову, у якой, апрача раду нападаў на цяперашні дзяржаўны лад і ўрад марш. Пілсудскага, ужыў зварот „szkalującego" гэты ўрад.

Той-жа суд разглядаў і справу нейкага Рэмэса і Залішаньскай, за „кольпартаваньне (пашырэньне) камуністычнай літэратуры і за разьвешваньне чырвоных сьцягаў".

Апэляцыйны Суд зацьвердзіў 3-х гадовую кару турмы Рэмэса, а 1 год 6 месяцаў кары турмы Залішаньскай зьменшыў на 3 месяцы.

Арыштаваньне „шпікоў" у Лідчыне. Як падаюць газэты, у аколіцах Ліды арыштавана 2 чалавека, у якіх, быццам, знойдзены сьпіскі складак на „rzecz" Грамады і вялікія сумы грошай. Сьледзтва, кажа гэтая газэта, ўсталіла, што арыштаваныя „зьяўляюцца сябрамі ГПУ, вядуць шпігоўскую акцыю на карысьць Радаў".

Бура ў Стаўпецкім павеце. 26-га гэтага месяца ў мяйсцовасьці Сьверыкова прайшоў ураган, які зьнішчыў больш 120 будынкаў, фруктовыя сады і засевы ў палёх. Потым ураган перайшоў на лясы, дзе павываротваў масу дзерава. Вывернутае дзерава прыдушыла ў лесе жыхара Сьвярынова, Язэпа Кісяля разам з канём. Цяжка ранены Кісель перавезены ў Стоўпцы.

Дэлегацыі безработных у Віленскага Ваяводы. 25 г. м. у Віленскага Ваяводы былі дзьве дэлегацыі безработных. Першай была дэлегацыя ўмысловых безработных, пазбаўленых распараджэньнем дэрэкцыі Фундушу Безрабоцьця запамогаў з гэтага „фундушу".

Другой была дэлегацыя фізычных безработных, якім дзяржаўная „даразьная" помач прадоўжана толькі да дня 31-га траўня гэтага году.

Будаўляныя работнікі жадаюць павялічэньня платы. 24./V. г. году да віцэ-прэзыдэнта Вільні, Чыжа, зьявілася дэлегацыя будаўляных работнікаў, працуючых на гарадзкіх работах. Дэлегацыя зажадала павялічэньня платы з 4 зл. 20 гр. да 6 зл. у дзень.

Сарваньне палюбоўнай камісіі. Палюбоўная камісія, скліканая 25 г. м. дзеля паразуменьня абшарнікаў (ziemian) з рольнымі работнікамі Ашмянскага павету, сарвана апазіцыйным становішчам абшарнікаў.

Работніцкая салідарнасьць. Нова-Вялейскія муляры выступілі з жаданьнем павялічэньня платы ўсім іх памочнікам. У раве невыпаўненьня іх жаданьняў, муляры пагражаюць забастоўкай.

З работніцкага руху ў Вільні. Забастоўка ў фабрыках цукеркаў прадаўжаецца. Працадаўцы ня хочуць павялічыць работніцкай платы.

Забастоўка ў Кальварыйскай гуце. У Кальварыйскай гуце выбухла забастоўка. Бастуючыя работнікі жадаюць выплаты залеглай платы.

Пякарскія работнікі жадаюць павялічэньня платы. Пякарскія работнікі зажадалі 20 проц. падвышкі платы.

Падвышка платы. На жаданьне браварных работнікаў, кіраўніцтва бровараў, згадзілася падвысіць ім на 25 проц. плату.

Адначасна, павялічана на 25 проц. плата работнікам спажывецкага промыслу.

Як бачым з гэтага, дык змаганьне працоўных за свае інтарэсы ўсё-ж дае і добрыя вынікі для іх.

Праз вастрогі.

Не плач над сабою, адчаю ня дайся,
О, люд пагарджаны, няшчасны, убогі —
Знайсьці сваю праўду усюды старайся,
І знойдзеш яе..... праз вастрогі.
Да сьветлае волі, да мэты высокай
Пакрытыя цернем твае ўсе дарогі —
Ня трацьжа надзеі і веры глыбокай,
Ты дойдзеш да іх..... праз вастрогі.
Да шчасьця... суравага лёсу рукою
Накрэсьлены шлях табе жорсткі і строгі—
Ня падай-жа духам і барацьбою
Здабудзеш яго..... праз вастрогі.
Хай ворагаў назласьць у хмары зьбярэцца,
Ня бойся й ня падай нікому у ногі —
Вер, сонца вясною табе усьміхнецца
І ўбачым яго... праз вастрогі.
Ня плач над сабою, адчаю ня дайся,
О, люд мой гаротны, няшчасны, убогі—
Да волі, да шчасьця ідзі і змагайся,
Здабудзеш ты іх.... праз вастрогі.

20/V 1928 г. Улад—Іміцкі.

З Т-ва Бел. Школы.

Да ведама ўсіх вучыцялёў-беларусаў, якія працуюць у польскіх школах і якія, хоць і не працуюць у школе, але маюць вучыцельскія кваліфікацыі і хацелі-б працаваць у беларускай урадавай школе.

Прадстаўніком Галоўнае Управы Т-ва Бел. Школы Віленскі Куратарыум запэўніў, што з наступнага 1928/29 школьнага году ўва ўсіх беларускіх урадавых школах, ужо адчыненых, а таксама маючых быць адчыненымі будуць, назначацца вучыцялі, добра ведаючыя беларускую мову. Дзеля гэтага Галоўная Управа, затурбаваная справай падшуканьня кваліфікаваных беларускіх вучыцялёў у гэтыя школы, зварочваецца з заклікам да ўсіх кваліфікаваных беларускіх вучыцялёў, працуючых у польскіх школах на ўсім абшары Польскае Рэспублікі, а таксама і непрацуючых і аканчываючых польскія вучыцельскія сэмінарыі, каб яны неадкладна давалі аб сабе ведамасьць у Галоўную Управу па адрасу: Вільня, вул. Сьв. Ганны 2-3, Галоўная Управа Т-ва Бел. Школы.

Усе гэтыя вучыцялі будуць прадстаўлены ў Віленскі Куратарыум, як кандыдаты на вучыцялёў у беларускія ўрадавыя школы.

Ведамасьці аб сабе трэба даць наступныя: 1) імя і прозьвішча, 2) кваліфікацыя (што, калі і дзе скончыў), 3) дзе цяпер працуе, 4) вучыцельскі стаж, 5) колькі гадоў, 6) адрас.

Галоўная Управа.

Да Акружных Управаў і Гурткоў Т-ва Бел. Школы.

Набліжаецца новы школьны год. Расьце трывога бацькоў за сваіх дзяцей, якім пара йсьці ў школу. Вучэньне вымагае грошай, і не малых грошай. А дзе іх узяць нашаму гаротнаму селяніну? Вось так і марнуюцца дзеці, часта вельмі здольныя да навукі. Ці грамадзянства нашае можа спакойна праходзіць міма гэтае балючае справы нашага жыцьця? Ці не сьвяты абавязак гурткоў і Акружных Управаў Т-ва Бел. Школы заапекавацца такімі дзяцьмі, каб даць ім магчымасьць атрымаць асьвету ў роднай гімназіі, на роднай мове? Інакш скуль-жа ў нас будуць асьвечаныя, культурныя працаўнікі і змагары на шляху адраджэньня? Гэтая справа абгаварвалася на галоўным зьезьдзе Т-ва Бел. Школы ў сьнежні 1927 г. і тады было пастаноўлена: зьвярнуцца з заклікам да Акружных Управаў і Гурткоў Т-ва Бел. Школы, каб закладалі стыпэндыі для сваіх кандыдатаў — вучняў беларускіх гімназіяў, зьбіралі ахвяры і складкі, ставілі спэктаклі, лекцыі на карысьць незаможных вучняў і т. д., каб памагчы найбольш здольным з вясковае беднаты атрымаць асьвету.

Аб гэтай пастанове Галоўная Управа лічыць на часе напомніць Акружным Управам, Гурткам і ўсім, каму дарагая родная асьвета, культура і шчасьце нашага народу.

Галоўная Управа.

Рэзалюцыя Галоўнае Управы Т-ва Бел. Школы, прынятая на засяданьні, якое адбылося дня 10 мая 1928 года.

Разглядалі справу адносінаў адміністрацыі да Т-ва Бел. Школы. Пастанавілі прыняць наступную рэзалюцыю і абвясьціць яе ў прэсе: Т-ва Беларускае Школы зьяўляецца адзінай салідной беларускай прасьветнай арганізацыяй. Гэтая арганізацыя, налічваючая тысячы сяброў, магла-бы вясьці шырокую культурную працу сярод свайго народу і такім чынам прычыніцца да падняцьця культурнага роўню насяленьня, што бязумоўна ні для каго ня шкодна, а, наадварот, карысна. Аднак-жа з сумам трэба сцьвярдзіць, што гэтае сваё высокае заданьне шырэньня асьветы сярод цёмнага сялянства Т-ва ня можа выпаўніць у поўнай меры па незалежных ад яго прычынах. Самая галоўная, а можа і адзіная, прычына затрыманьня разьвіцьця Т-ва заключаецца ў няпрыхільных, а часьцей, можна сказаць, варожых адносінах адміністрацыі на мяйсцох да Т-ва.

Варожыя гэтыя адносіны адміністрацыі выяўляюцца ў стаўляньні самых разнародных перашкод Гурткам, Акружным Управам і самай Галоўнай Управе, а часамі і простымі забаронамі ўсялякай працы іх. Прыкладамі такіх адносінаў адміністрацыі могуць служыць наступныя факты, якія ў розных варыяцыях вельмі часта паўтараюцца і сталіся масавымі. Старосты адмаўляюць у дазволе стаўляць спэктаклі дзеля браку тэатральных будынкаў, вымагаючы ад памяшчэньня, дзе мае адбыцца спэктакль, розных тэхнічных „ужондзэнь", што, ёсьць ведама, на вёсцы вельмі часта невыпаўніма (напр.: забарона Ваўкавыскага старасты на спэктакль гуртку ў в. Вялікія-Грынкі, Сьвіслацкае вол., два разы прасіўшага дазвол ад 21.IV 1928 года № 13504/III і ад 14.IV 28 г. № 12251/III).

Старосты забараняюць стаўляньне спэктакляў пад рознымі прадлогамі, што п'есы не працэнзураваны, што цэнзура не арыгінальная або цэнзура Камісара Ураду на м. Вільню ды самога навет Міністэрства прызнаецца не дастатачнай (Галоўная Управа найчасьцей цэнзуруе п'есы ў б. Камісара Ураду на м. Вільню цяпер — Гродзкае Староства). П'еса „Апошняе спатканьне" — Ул. Галубкі цэнзуравана самім Міністэрствам, аднак да пастаноўкі вельмі рэдка дапушчаецца.

А маладэчанскі староста адмаўляе, на прыклад, гуртку ў в. Літва, Палачанскай валасьці, у дазволе на спэктакль, ня ўказваючы навет прычынаў адмовы. Дзе выяўляецца імкненьне пабудаваць Народны Дом і ёсьць да гэтага магчымасьць, будова абстаўляецца такімі фармальнасьцямі, перамагчы якія вельмі цяжка (Клетное, Пружанскага павету). Горадзенскі староста без указаньня прычыны забараніў павятовы зьезд Т-ва ў Горадні.

Рэпрэсіі гэтыя стасуюцца да Т-ва бязупынна, сыстэматычна і што раз зьвялічваючыся, аж пакуль справа не дайшла да таго, што Пастаўскі староста, не даючы магчымасьці працаваць гуртком, самую гэтую прымушаную бязьдзейнасьць гурткоў паставіў прычынаю аканчальнай у недалёкай будучыні ліквідацыі гурткоў у Пастаўскім павеце.

Такія адносіны да Т-ва сьведчаць, што адміністрацыя ў некаторых выпадках, стаўляючы Т-ву перашкоды, часамі ўжо сходзіць з фармальнага законнага грунту ў сваіх адмовах легальнай культурнай працы Т-ва.

Усе гэтыя факты не паадзінокія, а масавыя, і іх можна сцьвярдзіць дакумантальна. Пратэстуючы проці такіх адносінаў адміністрацыі, Галоўная Управа канстатуе поўнае неразуменьне адміністрацыі культурна-асьветных патрэбаў Беларускага Народу і адначасна сцьвярджае, што Т-ва, як арганізацыя выключна асьветная, вядзе выключна культурна-асьветную працу.

Сход сяброў Радашкавіцкага Таварыства Беларускае Школы.

24./V. адбыўся сход сяброў Радашкавіцкага Т-ва Белар. Школы. Было прысутных 30 чалавек. Выбраны старшыня Рэв. Камісіі: 1) Шчэпан, 2) Шарамэт, 3) Лузгін, заступнікі Язэп Кайкоўскі і Іван Ліманоўскі. Пастаноўлена парупіцца аб арганізацыі землябробскай школы, пры ёй курсаў для дарослых, ладзіць на вёсках спэктаклі на карысьць Т-ва і арганізаваць зборку па ўсяму Маладэчанскаму пав. для Гімназіі.

Карэспандэнцыі.

Вось як гэта робіцца.

(Стаўпеччына).

У нядзелю, 6-га траўня, да мяне прышоў селянін з в. М.-Жухавічы, Жухавіцкай вол., Стаўбцоўскага пав. за радай, як ім быць, каб не папасьці ўпрасак, бо 5-га траўня настаўнік школы паўшэхнай В.-Жухавіцкай п. Бранкевіч, пазваўшы бацькоў, дзеці каторых прапусьцілі колькі дзён „занятак“, каб напісаць на іх пратакол, сказаў ім: вы летась зложылі дэкларацыі на ўрадавую беларускую школу ў вашай вёсцы—гэта добра. Пан Інспэктар мне сказаў, што школа ў вас польская будзе ператворана з новага школьнага году ў беларускую, толькі ўсе леташнія дэкларанты хай будуць ласкавы яшчэ раз падпішуць дэкларацыі і ўнясуць у іх сваіх дзяцей (пры гэтым даў ім 16 дэкляраций), сказаўшы, што рэшту іх атрымаеце ад свайго настаўніка p. Jałwińskiego. Тут селянін дастаў гэтую „дэкларацыю“ і паказаў мне. Я ўзяў „дэкларацыю“ ў рукі і зьдзівіўся, што гэты леташні вораг школы беларускай у гэтым годзе стаў яе абаронцам — гэтак гэтая „дэкларацыя“ звонку была падобна на нашу: № закону і паліцыя, навет: „Левін Я. Вільня, Нямецкая 22“, але калі ня верачы я стаў яе чытаць, то ажно жахнуўся, калі ў самым канцы ўбачыў замест слова „беларускае“, слова „дзяржаўнае“. Праўда, кажу, падлог ёсьць, вось ён, і паказаў селяніну. Той аж спацеў, як даведаўся, дый кажа: на што яны здольны!

Культурнік.

Як вядзецца культурная праца.

(Слонімшчына).

На Вялікдзень, 15. IV. с. г. М.-Галіцкі гурток Т-ва Бел. Школы хацеў паставіць у в. Сасноўцы ў пустым школьным будынку спэктакль, на якім мелі быць зграны п'есы „Суд“—Галубка і „Чорт і баба“—Ф. Аляховіча, дзеля гэтага 7-га таго-ж м-ца была зложана Слонімскаму Старасьце заява аб дазвол, а каб дазвол атрымаць (асабіста) — бо па-пошце атрымоўваем па тэрміне —пасылалі 2 раза пасланца да Староства, да якога маем 30 вёрст, аднак, пасланец нічога канкрэтнага ня мог дабіцца, апрача „ідзь, бэндзе пшэслано“. І былі пэўныя, што дазвол атрымаем. Усё прыгатавалі да пастаноўкі. Ажно атрымоўваем паперу ад Старосты, у якой паведамляе... — „залатвёно одмовне“—навет невыясьніўшы, з якіх прычын. А 12. IV. с. г. той-жа гурток падаў другую заяву аб дазвол на спэктакль ужо на дзень 22. IV. с. г., на якім мелі быць зграны „Няскончаная драма“ і „Раскіданае гняздо“. На гэты раз Староста даў..., але забарону далікатнейшую: зажадаў ад гуртка дазволу ад школьнага інспэктара на школьны будынак і „асьвядчэньне“ адказнае асобы, што бярэ на сябе адказнасьць за належнае адбыцьце спэктаклю, даўшы тэрмін выкананьня да 16. IV. с. г., а пратрымаўшы ў Старостве да 18. IV. с. г. Гэткім чынам, як першы, так і другі спэктакль адбыцца не маглі. Перад гэтым там-жа ставіліся спэктаклі і даваўся дазвол, а сёньня нешта сталася інакшай. Гэткі лёс спаткаў і другія гурткі. Але, каб гэтым толькі кончылася, то хоць крыўдна, але злосьць устрымаць можна. Але вось другі выпадак: на 29. IV. 28 г. Гладыскі гурток Т-ва Бел. Шк. Косаўскага павету, атрымаў дазвол на пастаноўку спэктаклю ў в. Гладышах з агаворкаю—„калі паліцыя прызнае памешканьне за адпаведнае“... Доўга артысты і глядзельнікі чакалі паліцыянтаў, а яшчэ даўжэй прышлося прасіць іх аб дазвол, якія прызналі памешканьне не адпаведным, бо нібы ўстава вымагае двое дзьвярэй і воду з бочкамі, гэта значыць на выпадак пажару, каб людзі не пагарэлі. Відаць, добра яны нас шкадуюць! А на другі раз паны заявілі, што ў жадным выпадку ставіць „невольно“. А выбіралі дом найлепшы з ўсяе вёскі: высокі, чарапіцамі крыты, а тут маеш—ае надаецца. Дый найдзі-ж дзе на вёсцы дом які меў-бы 2-е дзьвярэй, калі яшчэ мала хто з зямлянкі вылез. Тое, што робіцца на вёсцы, падаю толькі часткова, бо трэба памятаць, што цэнзар ёсьць, а то глядзі, уся праца на вецяр пайдзе.

Дык вось пры якіх абставінах прыходзіцца весьці культурна-асьветную працу на вёсцы!

Сусед.

Больш энэргіі, больш працы — даволі сну!

(Вёска Малахоўцы, Ястрабскай гміны, Баранавіцкага павету).

1 траўня 1927 г. быў пастаўлены ў нашай вёсцы беларускі спэктакль. Ладзіла яго аматарская група моладзі. Быў гэта першы пачын культурнае працы нашых поўсьвядомых элемэнтаў. Спэктакль выклікаў розныя гутаркі, выдзяляліся з іх асабліва тыя, што паходзілі ад цёмных несьвядомых хлапцоў. Аднак, нашы ініцыятары малую зьвярнулі ўвагу на гутаркі тых асоб, каторыя не зразумелі, што беларускі селянін скідае з сябе путы цемры і ўціску, што ад веку яго прыгняталі, а пачынае будзіцца да свайго нацыянальнага і сацыяльнага і разам з працоўнай беднатой ўсяго сьвету заваёўвае належачыя сабе правы. Цёмны і шкодны элемэнт нашае вёскі ня стаў на перашкодзе імкненьняў першых нашых змаганьняў з цемрай і 5. V. 27 г. быў заложаны Гурток Т-ва Беларускае Школы.

І вось цяпер, калі амаль праз год сабраліся нашы сябры на агульнае паседжаньне і калі азірнуліся ў прошлыя дні — дык з вялікім сумам трэба выявіць на старонках нашае газэты, што праца Гуртка, як пачалася з нуля, дык пры тэй-жа лічбе і засталася. Сумны абразок, але хай ён ня будзе прыкладам для іншых Гурткоў. Хай кожны сябра Т-ва Бел. Школы зразумее той вялікі абавязак, які ляжыць на кожным сябру Т-ва, хай зьдзейсьнівае і праводзіць у жыцьцё заданьні і мэты Т-ва, хай памятае аб тым, што наша культурная арганізацыя павінна быць кіраўніком у вызваленчым руху беларускае вёскі.

Цяпер наш Гурток пастанавіў выпісаць беларускія часопісі і газэты і шырыць іх сярод сялянства, а таксама павялічваць рады свае арганізацыі. Пастанавіў на мэце зладзіць спэктакль, але мае адну малую перашкоду з жаночымі сіламі, каторых баламуцяць шкоднікі нашае працы. Ня слухайце, дзяўчаткі, гутарак і намоў панскіх падлізьнікаў, але дружна і згодна дапамагайце ў культурнай працы. Вырадкам нашага працоўнага народу ня можа быць месца ў нашых радох. Ход жыцьця з такімі разьлічыцца.

Дык зварачваюся да Вас, сябры Т-ва Бел. Школы (а асабліва да нашага Гуртка), з заклікам, каб больш энэргіі, больш працы—даволі сну!

Хай кожны мамэнт, кожная хвіліна вольнага часу не марнуецца дарма, але выкарыстоўвайце яго для культурнага адраджэньня вякамі загнанай у цемру нашае старонкі, а гэтым самым Вы ўскорыце ход барацьбы працоўнага народу, а нашае маладое пакаленьне дачакаецца вызваленьня прыгнечанага працоўнага народу.

А тым шкодным элемэнтам, што перашкаджаюць у нашай працы ў вызваленьні працоўнага народу — ганьба! а наш адказ гэтым панскім падлізьнікам — пагарда!

Дык больш працы, больш энэргіі!

У. К.

Ці доўга будзем спаць?

Вёска беларуская, цёмная, забітая, годзе спаць! Ужо часісьці на змаганьне! Цябе даўно ўжо чакае вялікая праца на карысьць працоўнага народу. Што-ж мы павінны рабіць? А вось што! Перадусім нашым заданьнем ёсьць — арганізавацца, каб супольнымі сіламі змагацца з пануючай цемрай, каб супольнымі сіламі змагацца за лепшае заўтра.

Баявым заданьнем беларускага працоўнага народу ёсьць арганізацыя каапэратываў. Што-ж можа даць працоўным масам каапэратыў?

Пакуль што ўявім сабе, што ў сучасны момант ёсьць гандаль. Кожын ведае, што калі існуе капіталізм, ці грашовая сыстэма, дык працоўнік за сваю работу атрымлівае грошы. У гэтым крыецца несправядлівасьць сучаснага ладу. Працаўнік, які вырабляе, ці здабывае соль, нафту, цукер, крамніку за сваю работу дастарчае грошы. Заробак свой ён нясе ў краму і купляе сабе там неабходнае, як хлеб, соль, цукер і г. д.

Селянін, які працуе ў полі за плугам, ізноў сваім толькі ня можа абыйсьціся, а мусіць частку сваіх прадуктаў прадаць, каб купіць сабе неабходныя рэчы, як зялеза, газа, цукер і г. д.

Выходзіць так, што тое, што вырабляе работнік, патрэба селяніну і наадварот, што вырабляе селянін, патрэбна работніку. Але вось неяк выйшла так, што паміж гэтымі двума клясамі вытварылася трэцьцяя, якая, як кажуць, „ні сее, ні жне, і найлепей жыве“. Тавар, выйшаўшы з рук работніка, ці селяніна пройдзе вялікую дарогу прадажы і перапрадажы з адных рук у другія і, пакуль прыдзе ў рукі спажыўца, падымаецца ў цане бывае ў некалькі разоў. І вось, каб ня даць карміць гэтых непатрэбных пасярэднікаў, злучаймася, тварэм каапэратывы.

Кожын селянін, ці работнік, сьвядомы свайго клясавага становішча, мусіць лучыцца і тварыць каапэрацыю!

Ужо час! Грош да гроша складайце тысячы мазольных рук! Імкнецеся стварыць новае, свабоднае, брацкае жыцьцё.

Гэтае „злучайцеся“ было кінута ў нашай старонцы, вынікам чаго было арганізаваньне многіх каапэратываў, але, відаць, ня ўсе сабе добра ўявілі важнасьць гэтай справы. Большая частка гэтых каапэратываў у час інфляцыі польскай маркі заняпалі і кончылі сваё жыцьцё. Шмат хто ў гэтым убачыў непатрэбнасьць, ці немагчымасьць каапэратыўнай прадажы.

Дык яшчэ раз зьвяртаюся да вас, сяляне і работнікі! Адклікнецеся ідучай вам на дапамогу ў вызваленьні з-пад ярма няволі каапэрацыі.

А. Мікуліч.

Усюды будзяцца, а ў нас яшчэ сьпяць!

(Вёска Рачканы, Ляхавіцкае гміны, Баранавіцкага павету).

У кожным нумары нашай газэты „Голас Працы“ знаходзяцца карэспандэнцыі з вёсак, у якіх пішацца, што нашая цёмная вёска прабуджаецца са сну. Яна пазнала, што так надалей нельга жыць, і, каб палепшыць дабрабыт у вёсцы, трэба працаваць, і то працаваць не абы як! Ува-ўсіх кутках нашай Бацькаўшчыны прабуджаюцца яе сыны і ідуць супольным фронтам проці цемры, каб зьнішчыць гэтага ворага нашай вёскі, каб падняць яе дабрабыт, — а ў нашай вёсцы зусім рэзкія праціленжнасьці. Такія-ж самыя сыны свайго краю і так-жа сама павінны працаваць, але яны сабе сьпяць і, як гаворыцца, „у вус ня дуюць“. І калі яны абудзяцца, то проста ня можна прадбачыць.

Праўда, больш сьвядомыя сяляне выступалі проці ўсяго гэтага, але надарма! Бо што значыць жытні каласок насярод дзікай травы? Нічога! Усёроўна заглохне, бо не даюць яму разрасьціся.

Цэлую нашу вёску можна падзяліць на сялян, трохі сьвядомых, каторыя думаюць так: „Ай, якая-б то ня была ўлада, усёроўна з сялян будуць зьдзекавацца“. А як пачнеш яму тлумачыць, што ўсё роднае лепей, дык рукой махне.

Вялікая цемната!!!

Другая частка людзей нашай вёскі — гэта тыя, каторыя зусім нічога не разумеюць і для іх — гэтай часткі, толькі патрэбны кіраўнік, то ўсё-б пайшло інакшай.

А як яны могуць каго вучыць, калі яшчэ іх трэ' вучыць!

Дзеля гэтага дзеці іх гадуюцца зусім без выхаваньня. Як ідуць вуліцай, хлапцы як адзін, —па гадоў 18—19, як дубы, а глядзячы на іх падумаеш: „Вось каб іх з'арганізаваў, ды разам стаўляў спэктаклі, і г. д. вялікая-б была помач працоўным! А то бяз працы бадзяюцца, п'юць.

Ну, дык ці не пара Вам, браткі, прабудзіцца? Ці не пара ўзяцца за працу для дабра працоўнага народу! Пратрэце вочы, бо ўжо сонца змаганьня ўсходзіць над нашым родным краем і сваімі праменьнямі многіх прабудзіла ад сну!

Хутчэй, браты, да працы!

Вораг цемры.

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпішчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Сяляне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўняе ей існаваньне.

Паштовая скрынка.

Ю. Сяргіевічу. Ваш зборнік вершаў будзе з пэўнымі папраўкамі надрукаваны. — **М. Станкевічанцы.** Вашае пісьмо, на жаль, ня можа быць зьмешчана на старонках нашае сялянска-работніцкае газэты. На гэта зусім гадзіцца „Narod“, рэдактары якога, здаецца, паважна канкуруюць з Вашым былым шэфам, а цяперашнім ворагам, „дзедам“ Вярвікоўскім. Для беларускага працоўнага руху Вярвікоўскі цяпер—нуль, як і яго памочнік студ. Цырскі разам з усею разбэшчанаю кампаніяй.

М. С—му. Пішучы карэспандэнцыі, трэба падаваць праўдзівае прозьвішча і адрас.—**Ворагу цемры.** Пішэце больш, але толькі на адзэй старонцы. — **Бяздольнаму.** Вашы справаздачы аб спэктаклях памеры магчымасьці карыстаем. Пішэце аб зьдзеках, якія чыняць нашы ворагі на вёсцы. — **Свайму.** Карэспандэнцыя Ваша аб „баданьні“ школьных дэкларацыяў вельмі добрая. Дзякуем. Пішэце больш. Дзеля нястачы месца зьмесьцім у наступным нумары.—**Агню.** За карэспандэнцыю дзякуем. Пішэце больш, толькі на лепшай паперы і выразьней. Падавайце больш выразна сваё запраўднае прозьвішча для ведама Рэдакцыі. **Падпішчыку № 3560.** Пішэце коратка і ясна, бо ў газэце не хапае месца. Прысланыя Вамі карэспандэнцыі, скараціўшы, зьмесьцім.— **В. Чаромсе.** Ваша карэспандэнцыя „Цемра і няшчасьце“ не падыходзіць да друку. — **А. К—чу.** За карэспандэнцыю дзякуем. З прычыны нястачы месца ў гэтым нумары зьмясьціць ня можам. Пішэце больш.

Усім іншым нашым карэспандэнтам. З прычыны ажыўленьня руху, газэта ня можа зьмясьціць у час усе карэспандэнцыі. Просьба прысылаць карэспандэнцыі магчыма карацей, аднак ня спыняць прысылкі. Няхай кожнае зьявішча нашых местаў і вёсак знойдзе адбітак у сваей часопісі. Надасланыя карэспандэнцыі будуць зьмешчаны ў скарочаным відзе.

Выйшла з друку невялічкая, але-ж дужа карысная для прыхільнікаў коопэрацыі кніжачка:

„Як залажыць спажывецкі коопэратыў“,

апрацаваная **М. МАНЦЭВІЧАМ.**

У ёй зьмяшчаюцца ўсе неабходныя інструкцыі аб закладаньні коопэратываў да ўзору паданьняў уключна.

Напісана ясна і падрабязна.

Цана зусім нізкая,—усяго 10 грошаў.

За спраўкамі зьвяртацца ў Віленскі Белар. Каапэратыўны Банк, Віленская вул. № 8.

Ніколі не зьнішчажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Да Паважаных Падпішчыкаў.

Гэтым даводзім да ведама ўсіх нашых Паважаных грам. Падпішчыкаў, што хто не ўрэгулюе падпісной платы да **1-га чэрвеня** *с. г., таму высылка газэты будзе спынена.*

Бясплатна газэту высылаем толькі вязьням.

Адміністрацыя.

Вышла 3 кніжка

ілюстраванае часопісі для дзяцей

„ЗАРАНКА“

—) Бясплатна рассылацца ня будзе. (—

Рэдакцыя просіць усіх, жадаючых мець „ЗАРАНКУ“, пасьпяшыць **ПРЫСЛАЦЬ ПАДПІСКУ.**

Падпісная цана з перасылкай: 3 кніжкі 1 злоты. Адна кніжка 40 гр.

Рэдакцыя і Адміністрацыя: Вільня, Віленская вул. 12—6.

Ад дырэкцыі Віленскае Беларускае Гімназіі.

Аб умовах прыйма вучняў на новы 1928/29 школьны год.

Згодна з распараджэньнем Куратара Віленскага Школьнага Вокругу ад 10 гэтага траўня, уступныя экзамены ў I, II, III, IV, V, VI, і VII кл. адбываюцца выключна вясною. Для паступленьня ў Віленскую Беларускую Гімназію вызначаны тэрмін экзамену; 21, 22 і 23 чэрвеня ўва ўсе клясы (II-VII), 27-28 чэрвеня ў I клясу. У восені да ўступных экзаменаў вучні дапускаюцца толькі з дазволу Куратарыума, па прадстаўленьню Дырэкцыі Гімназіі. На будучы школьны год вакансіі маюцца ўва ўсіх клясах. Прыймаюцца хлопцы і дзяўчыны.

Узрост: У першую клясу ад $9\frac{1}{2}$ да 12 гадоў, у 2-ю клясу ад $10\frac{1}{2}$ да 13 гадоў, у 3-ю клясу ад $11\frac{1}{2}$ да 14 гадоў, у 4-ю клясу ад $12\frac{1}{2}$ да 15 гадоў і т. д., лічучы па дзень 1-га ліпня 1928 года.

Дакуманты: 1) Заява аб прыйме, 2) мэтрыка, 3) пасьведчаньне доктара аб паўторным прышчэпе воспы і 4) пасьведчаньне аб папярэдняй адукацыі. Заявы і дакуманты трэба прысылаць загадзя да экзаменаў не пазьней 10-га чэрвеня, у першую клясу—25-га чэрвеня.

Праграмы можна выпісваць па пошце з канцэлярыі Гімназіі (Вільня, Вострабрамская вуліца дом № 9), далучаючы на перасылку паштовую марку ў 25 грошай.

Як паказалі мінулыя гады, некаторыя вучні зьяўляюцца на экзамен, ня ведаючы добра праграмы прадметаў, з якіх трэба трымаць экзамены. Дзеля гэтага зварочваецца ўвага, што паступаючыя ў якую-колечы клясу з польскіх пачаткавых ці сярэдніх школаў павінны абавязкава трымаць экзамен па адпаведным праграмам з беларускае мовы (чытаньне, пісаньне, граматыка, вершы, тэорыя і гісторыя літэратуры) і гісторыі Беларусі за курс II і III клясы.

Паступаючым з хатняю падгатоўкаю прапануецца адносна праграмаў і падручнікаў зварочвацца ў канцэлярыю Гімназіі для падрабязнага вытлумачэньня, па якому курсу і з якіх прадметаў трэба трымаць экзамены.

Падручнікі можна выпісваць: Беларуская Кнігарня Беларускага Выд. Т-ва (Вільня Вострабрамская № 1).

Плата за навуку мае быць устаноўлена Куратарыумам. Аб гэтым будзе своечасова абвешчана.

У інтэрнаце (толькі для хлапцоў) прадбачыцца ад 20 да 30 вакансіяў выключна для вучняў малодшых клясаў, з платаю за ўтрыманьне ад 50 да 60 зл. у месяц.

Дырэктар: С. Паўловіч.

Рэдактар-Выдавец: А. Лагода.
Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.